БИБЛИОТЕКА
БГУ

СПЕЦВЫПУСК ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

18 студзеня 2007 года, № 1 (1952)

# ЗАПРАШАЕ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ!



*Рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта прафесар Васіль Іванавіч СТРАЖАЎ*

Беларускі дзяржаўны універсітэт — найстарэйшы класічны універсітэт нашай краіны, вядучая вышэйшая навучальная ўстанова ў сістэме нацыянальнай адукацыі, буйнейшы адукацыйны, навукова-вытворчы і культурны цэнтр Рэспублікі Беларусь. Летась у кастрычніку універсітэт адзначыў 85 гадоў з дня свайго заснавання.

Зараз у БДУ навучаецца больш за 23000 студэнтаў, у тым ліку звыш 17 тысяч — на дзённай форме і каля 6 тысяч — на завочнай форме навучання. Іх падрыхтоўкай займаюцца амаль 3000 выкладчыкаў, у тым ліку 4 акадэмікі і 12 членкарэспандэнтаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, каля 400 прафесароў і больш за 1600 кандыдатаў навук. Навучальны працэс вядзецца па 57 спецыяльнасцях і звыш 200 спецыялізацыях і напрамках.

У 2007 годзе прыём на першы курс будуць ажыццяўляць 16 факультэтаў, а таксама Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій, Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій, Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы. Усяго плануецца прыняць каля 2000 абітурыентаў.

Студэнты, паспяховасць якіх не ніжэй за "сем", пасля заканчэння другога курса могуць на платнай аснове паралельна навучацца па другой спецыяльнасці і ў выніку атрымаць два дыпломы.

Ва універсітэце пастаянна вядзецца пошук новых метадаў і тэхналогій выкладання і арганізацыі навучальнага працэсу, якія скіраваны на стварэнне ўмоў для самастойнага набыцця ведаў пры кансультацыях і пад кантролем высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Арганізацыя навучальнага працэсу ў БДУ грунтуецца на абавязковым спалучэнні яго з навукова-даследчай дзейнасцю. Нашы выпускнікі сёння працуюць па ўсёй краіне і далёка за яе межамі, і ўсюды яны пацвярджаюць высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі.

Асаблівая ўвага ва універсітэце надаецца ўмацаванню кааперацыі ў галіне адукацыі і навукі з іншымі айчыннымі і замежнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. БДУ мае пагадненні аб супрацоўніцтве больш чым з 100 універсітэтамі з 31 краіны свету. Пакладзены пачатак распрацоўцы і ўкараненню сумесных з замежнымі універсітэтамі вучэбных курсаў з выдачай сертыфікатаў, сапраўдных у Рэспубліцы Беларусь і ў краіне-партнёры.

Ва універсітэце створаны добрыя ўмовы для працы і адпачынку. Каля 75 % іншагародніх студэнтаў пражываюць у 10 добраўпарадкаваных інтэрнатах. Да паслуг студэнтаў — стадыёны, спартыўныя і трэнажорныя залы, басейны. Дзейнічае больш за 60 агульнауніверсітэцкіх творчых калектываў і аб'яднанняў. Працуе 8 народных калектываў, сярод якіх ансамбль танца «Крыжачок», фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш», фальклорны ансамбль «Тутэйшая шляхта», узорны дзіцячы ансамбль танца «Літарынка», студэнцкі тэатр «На балконе», музычна-драматычны тэатр «На філфаку», харавая капэла, аркестр народных інструментаў, хор супрацоўнікаў і выкладчыкаў БДУ «Родніца». Папулярнасцю ў студэнтаў карыстаюцца Цэнтр сучаснага стылю і моды, клуб аўтарскай песні, студыя эстраднай песні, разнастайныя гурткі па інтарэсах.

Дарагія абітурыенты! Беларускі дзяржаўны універсітэт зацікаўлены ў тым, каб у яго аўдыторыі прыйшлі самыя падрыхтаваныя і таленавітыя маладыя людзі. Незалежна ад выбранай спецыяльнасці навучання ў вас ёсць магчымасць атрымаць тут адукацыю сусветнага ўзроўню.

***Жадаем поспехаў!***

## ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ БДУ – 2007

**Старшыня прыёмнай камісіі — рэктар БДУ прафесар Васіль Іванавіч СТРАЖАЎ.**

**Намеснік старшыні — прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Віктар Васільевіч САМАХВАЛ.**

**Намеснік старшыні — прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Уладзімір Леанідавіч КЛЮНЯ.**

**Адказны сакратар — начальнік Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы Людміла Міхайлаўна ХУХЛЫНДЗІНА.**

**Адрас прыёмнай камісіі: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, корпус геаграфічнага факультэта.**

**Даведкі па тэл. 209-50-85.**

## ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ:

Парадак прыёму ў Беларускі дзяржаўны універсітэт на 2007 год
Стар. 2

Пералік уступных выпрабаванняў у БДУ на 2007 год
Стар. 3

Інфармацыя пра факультэты БДУ
Стар. 4-15

Культура, спорт і студэнцтва ў БДУ
Стар. 16

**Паважаныя абітурыенты!**

У сакавіку-красавіку пройдуць чарговыя **«Дні адкрытых дзвярэй»**, у рамках якіх на шэрагу факультэтаў прыродазнаўчанавуковага профілю (біялогіі, фізікі, хіміі, радыёфізікі і інш.) будуць арганізаваны кансультацыі і правядзенне пробных уступных экзаменаў па матэрыялах прыёмнай камісіі 2007 г.

***

Рэдакцыя газеты «Універсітэт» сумесна з прыёмнай камісіяй БДУ рыхтуе да друку яшчэ адзін спецвыпуск для абітурыентаў, дзе плануецца размясціць «Палажэнне аб правядзенні ўступных выпрабаванняў», план прыёму, кошт навучання, графік правядзення «Дзён адкрытых дзвярэй» і іншую інфармацыю.

***

**Спецыяльныя выпускі газеты "Універсітэт" для абітурыентаў** можна набыць у кніжных кіёсках "Універсітэцкая кніга", размешчаных у фае галоўнага корпуса БДУ (праспект Незалежнасці, 4), у карпусах юрыдычнага факультэта (вул. Ленінградская, 8), хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14), філалагічнага факультэта (вул. К.Маркса, 31), а таксама ў інтэрнаце № 2 студгарадка БДУ (вул. Кастрычніцкая, 2).

# ПАРАДАК ПРЫЁМУ Ў БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ НА 2007 ГОД




1. Прыём у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт ажыццяўляецца ў адпаведнасці з «Правіламі прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы», зацверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (№ 80 ад 7 лютага 2006 г.).

2. Пералік уступных выпрабаванняў па кожнай спецыяльнасці даецца ў Дадатку 1.

3. Дакументы ад паступаючых у БДУ на дзённую і завочную формы навучання прымаюцца з 12 па 29 ліпеня (на ваенны факультэт — з 12 па 26 ліпеня). Уступныя выпрабаванні праводзяцца з 31 ліпеня па 4 жніўня. Залічэнне ў склад студэнтаў на дзённае бюджэтнае навучанне — па 6 жніўня.

Дакументы ад абітурыентаў, якія вытрымалі ўступныя выпрабаванні, але не прайшлі па конкурсе на дзённае бюджэтнае навучанне ў БДУ, для ўдзелу ў конкурсе на завочнае бюджэтнае навучанне прымаюцца па 7 жніўня. Залічэнне ў склад студэнтаў на завочнае бюджэтнае навучанне — па 8 жніўня.

Дакументы ад абітурыентаў, якія вытрымалі ўступныя выпрабаванні, але не прайшлі па конкурсе на дзённае або завочнае бюджэтнае навучанне ў БДУ або іншыя ВНУ Рэспублікі Беларусь, для ўдзелу ў конкурсе на залічэнне на дзённае і завочнае платнае навучанне прымаюцца па 9 жніўня. Залічэнне ў склад студэнтаў на дзённае і завочнае платнае навучанне — па, 11 жніўня.

4. Уступныя выпрабаванні праводзяцца па праграмах, што складзены на аснове адукацыйных стандартаў агульнай сярэдняй адукацыі і зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Творчае ўступнае выпрабаванне на спецыяльнасці «журналістыка (напрамак — друкаваныя СМІ)», «журналістыка (напрамак — аўдыёвізуальныя СМІ)», «інфармацыя і камунікацыя (напрамак — тэхналогіі камунікацыі)», «літаратурная работа (напрамак — рэдагаванне)», «міжнародная журналістыка» факультэта журналістыкі, спецыяльнасць «журналістыка (напрамак — друкаваныя СМІ, спецыялізацыя — ваенная журналістыка)» ваеннага факультэта і творчае ўступнае выпрабаванне на спецыяльнасць «дызайн (напрамак — дызайн прадметна-прасторавых комплексаў)» Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій, спецыяльнасць «дызайн (напрамак — камунікатыўны дызайн)» гуманітарнага факультэта праводзяцца па праграмах, якія распрацаваны БДУ і зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Уступнае выпрабаванне па біблейскай гісторыі на спецыяльнасць «тэалогія» Інстытута тэалогіі імя Святых Мяфодзія і Кірылы праводзіцца па праграме, якая распрацавана БДУ і зацверджана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Уступныя выпрабаванні па прававых дысцыплінах для абітурыентаў, якія паступаюць на скарочаны тэрмін навучання на спецыяльнасць «правазнаўства» юрыдычнага факультэта, праводзяцца па прадметах вучэбнага плана сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

5. На ваенны факультэт прымаюцца: грамадзяне Рэспублікі Беларусь ва ўзросце ад 17 да 21 года (у тым ліку тыя, якія дасягнуць 17-гадовага ўзросту або дасягнулі 21-гадовага ўзросту ў год паступлення на вучобу); грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія прайшлі або праходзяць тэрміновую ваенную службу або службу ў рэзерве ці прайшлі ваенную службу па кантракце, — ва ўзросце да 23 гадоў; ваеннаслужачыя, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, — ва ўзросце да 25 гадоў. Асобы з ліку грамадзянскай моладзі і асобы, якія адслужылі тэрміновую ваенную службу або службу па кантракце, прымаюцца па накіраваннях раённых (гарадскіх) ваенных камісарыятаў; асобы, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, ваенную службу па кантракце, прымаюцца па накіраваннях камандзіраў воінскіх часцей.

Асобы, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту, прадстаўляюць разам з іншымі дакументамі пісьмовую згоду аднаго з бацькоў або законнага прадстаўніка.

На спецыяльнасці «псіхалогія (спецыялізацыя — маральна-псіхалагічнае забеспячэнне воінскай дзейнасці)», «хімія (напрамак — радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона)», «правазнаўства (спецыялізацыя — юрысконсульцкая работа ў ваеннай сферы)», «журналістыка (напрамак — друкаваныя СМІ, спецыялізацыя — ваенная журналістыка)», «геаграфія (спецыялізацыя — геаінфармацыйныя сістэмы ваеннага прызначэння)» прымаюцца толькі асобы мужчынскага полу, на спецыяльнасць «міжнародныя адносіны (спецыялізацыя — міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы)» — мужчынскага і жаночага полу.

Да пачатку ўступных выпрабаванняў ажыццяўляецца прафесійны адбор па наступных напрамках: стан здароўя, фізічная падрыхтаванасць, прафесійна-псіхалагічны адбор. На спецыяльнасць «міжнародныя адносіны (спецыялізацыя — міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы)» прафесійна-псіхалагічны адбор ажыццяўляецца спецыяльнай адборачнай камісіяй Міністэрства абароны. Абітурыенты, не прайшоўшыя прафесійны адбор, да здачы ўступных выпрабаванняў і ўдзелу ў конкурсе на залічэнне не дапускаюцца.

6. На спецыяльнасць «тэалогія» Інстытута тэалогіі імя Святых Мяфодзія і Кірылы прымаюцца асобы па характарыстыках-рэкамендацыях настаяцеляў царкоўных прыходаў.

7. Выпускнікі юрыдычнага каледжа БДУ маюць права паступаць на юрыдычны факультэт па спецыяльнасці "правазнаўства" на скарочаны тэрмін дзённай або завочнай формы навучання.

8. Пры паступленні на дзённую бюджэтную форму навучання на механіка-матэматычны факультэт, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, фізічны факультэт, факультэт радыёфізікі і электронікі, хімічны факультэт, біялагічны факультэт, гістарычны факультэт, эканамічны факультэт конкурс праводзіцца па факультэце ў цэлым.

Пры паступленні на дзённую бюджэтную форму навучання на геаграфічны факультэт агульны конкурс праводзіцца для спецыяльнасцей «геаграфія», «геаграфія (напрамак — геаінфармацыйныя сістэмы)», «геаграфія (напрамак — гідраметэаралогія)», «геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў». Пры паступленні на дзённую бюджэтную форму навучання на факультэт журналістыкі агульны конкурс праводзіцца для спецыяльнасцей «журналістыка (напрамак — друкаваныя СМІ)», «журналістыка (напрамак — аўдыёвізуальныя СМІ)». Пры паступленні на дзённую бюджэтную форму навучання на юрыдычны факультэт агульны конкурс праводзіцца для спецыяльнасцей «правазнаўства», «эканамічнае права». Пры паступленні на дзённую бюджэтную форму навучання на гуманітарны факультэт агульны конкурс праводзіцца для спецыяльнасцей «сацыялогія (спецыялізацыя — метадалогія і метады сацыялагічнага даследавання)», «сацыялогія (спецыялізацыя — сацыялогія масавых камунікацый)», для спецыяльнасцей «сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — камп'ютэрная лінгвістыка)», «сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — камп'ютэрнае навучанне мовам)» і для спецыяльнасцей «псіхалогія (спецыялізацыя — сацыяльная псіхалогія)», «псіхалогія (спецыялізацыя — метадалогія і метады псіхалагічнага даследавання)».

Пры паступленні на дзённую бюджэтную форму навучання на іншыя факультэты конкурс праводзіцца па асобных спецыяльнасцях.

Пры паступленні на завочную бюджэтную форму навучання, а таксама на дзённую і завочную платныя формы навучання конкурс праводзіцца па асобных спецыяльнасцях.

9. На профіль «міжнародныя адносіны» (спецыяльнасці «міжнародныя адносіны», «лінгвакраіназнаўства», «сусветная эканоміка», «менеджмент (спецыялізацыя — менеджмент у сферы міжнароднага турызму)», «міжнароднае права»), профіль «правазнаўства» (спецыяльнасці «правазнаўства», «эканамічнае права»), а таксама на спецыяльнасці, па якіх у 2006 годзе конкурс склаў 5 і болей чалавек на месца, пазаконкурсны прыём у 2007 годзе ажыццяўляцца не будзе. Асобы, якія маюць права на залічэнне па-за конкурсам, пры паступленні на гэтыя спецыяльнасці будуць мець пераважнае права на залічэнне пры аднолькавай колькасці балаў.

Пералік спецыяльнасцей, па якіх пазаконкурсны прыём у 2007 годзе ажыццяўляцца не будзе, даецца ў Дадатку 2.

10. Лічбавае фатаграфаванне абітурыентаў на экзаменацыйныя лісты ажыццяўляецца за наяўны разлік пры падачы дакументаў.

11. Пры іншых роўных умовах пераважнае права на залічэнне пры паступленні на адпаведныя факультэты ў дадатак да п. 24 «Правіл прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы» ў парадку пералічэння маюць:

– пераможцы алімпіяд «Абітурыент БДУ-2007»;
– выпускнікі ліцэя БДУ;
– выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення БДУ.



*Фота Максіма ГУЧАКА, БелТА*

## ДАДАТАК 1

# ПЕРАЛІК УСТУПНЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ У БДУ НА 2007 ГОД (ДЗЁННАЯ І ЗАВОЧНАЯ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ)

| Факультэты, спецыяльнасці, напрамкі спецыяльнасцей, спецыялізацыі | Пералік выпрабаванняў |
|---|---|
| **МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Матэматыка (напрамак — навукова-вытворчая дзейнасць)<br>2. Матэматыка (спецыялізацыя — матэматычная электроніка)<br>3. Матэматыка (спецыялізацыя — камп'ютарная матэматыка)<br>4. Матэматыка (спецыялізацыя — Web-праграмаванне і Internet-тэхналогіі)<br>5. Матэматыка (напрамак — навукова-педагагічная дзейнасць)<br>6. Матэматыка (напрамак — эканамічная дзейнасць)<br>7. Механіка<br>8. Механіка (спецыялізацыя — камп'ютарная механіка) | 1. Матэматыка (пісьмовы экзамен)<br>2. Фізіка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ**<br>1. Прыкладная матэматыка<br>2. Інфарматыка<br>3. Эканамічная кібернетыка<br>4. Актуарная матэматыка<br>5. Камп'ютэрная бяспека (напрамак — матэматычныя метады і праграмныя сістэмы) | 1. Матэматыка (пісьмовы экзамен)<br>2. Фізіка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Фізіка (напрамак — навукова-даследчая дзейнасць)<br>2. Фізіка (напрамак — вытворчая дзейнасць)<br>3. Фізіка (напрамак — навукова-педагагічная дзейнасць)<br>4. Фізіка (напрамак — кіраўніцкая дзейнасць) | 1. Фізіка (пісьмовы экзамен)<br>2. Матэматыка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЕФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ**<br>1. Радыёфізіка<br>2. Фізічная электроніка<br>3. Камп'ютарная бяспека (напрамак — радыёфізічныя метады і праграмна-тэхнічныя сродкі) | 1. Фізіка (пісьмовы экзамен)<br>2. Матэматыка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Хімія (напрамак — навукова-вытворчая дзейнасць)<br>2. Хімія (напрамак — навукова-педагагічная дзейнасць)<br>3. Хімія (напрамак — ахова навакольнага асяроддзя)<br>4. Хімія (спецыялізацыя — хімія лекавых прэпаратаў) | 1. Хімія (пісьмовы экзамен)<br>2. Матэматыка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Геаграфія<br>2. Геаграфія (напрамак — геаінфармацыйныя сістэмы)<br>3. Геаграфія (напрамак — гідраметэаралогія)<br>4. Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў | 1. Геаграфія (пісьмовы экзамен)<br>2. Матэматыка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 5. Геаэкалогія | 1. Геаграфія (пісьмовы экзамен)<br>2. Біялогія (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Біялогія<br>2. Біялогія (напрамак — біятэхналогія)<br>3. Біяэкалогія | 1. Біялогія (пісьмовы экзамен)<br>2. Хімія (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Гісторыя<br>2. Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны<br>3. Гісторыка-архівазнаўства<br>4. Дакументазнаўства і інфармацыйнае забеспячэнне кіравання | 1. Сусветная гісторыя навейшага часу (пісьмовы экзамен)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ**<br>1. Журналістыка (напрамак — друкаваныя СМІ)<br>2. Журналістыка (напрамак — аўдыёвізуальныя СМІ)<br>3. Інфармацыя і камунікацыя (напрамак — тэхналогіі камунікацыі)<br>4. Літаратурная работа (напрамак — рэдагаванне)<br>5. Міжнародная журналістыка | 1. Творчасць (1 этап — творчае сачыненне, 2 этап — творчае тэсціраванне)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Беларуская філалогія<br>2. Славянская (славацкая і беларуская) філалогія | 1. Беларуская літаратура (вусны экзамен з пісьмовым заданнем)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова (ЦТ) |
| 3. Руская філалогія<br>4. Славянская (славацкая і руская) філалогія | 1. Руская літаратура (вусны экзамен з пісьмовым заданнем)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Руская мова (ЦТ) |
| 5. Рамана-германская (англійская) філалогія | 1. Англійская мова (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 6. Рамана-германская (нямецкая) філалогія | 1. Нямецкая мова (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 7. Рамана-германская (французская) філалогія | 1. Французская мова (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 8. Рамана-германская (італьянская) філалогія<br>9. Усходняя (кітайская) філалогія | 1. Замежная мова (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Эканамічная тэорыя<br>2. Эканоміка<br>3. Фінансы і крэдыт<br>4. Менеджмент (спецыялізацыя — міжнародны менеджмент) | 1. Матэматыка (ЦТ)<br>2. Замежная мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |

| Факультэты, спецыяльнасці, напрамкі спецыяльнасцей, спецыялізацыі | Пералік выпрабаванняў |
|---|---|
| **ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Паліталогія | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 2. Правазнаўства (акрамя выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ)<br>3. Эканамічнае права | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Матэматыка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 4. Правазнаўства (для выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ) | 1. Тэорыя права, канстытуцыйнае і адміністрацыйнае права (пісьмовы экзамен)<br>2. Грамадзянскае і крымінальнае права (пісьмовы экзамен)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК**<br>1. Філасофія<br>2. Сацыялогія<br>3. Інфармацыя і камунікацыя (напрамак — сацыяльныя тэхналогіі, навукова-педагагічная дзейнасць) | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 4. Псіхалогія | 1. Біялогія (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН**<br>1. Міжнародныя адносіны<br>2. Лінгвакраіназнаўства<br>3. Міжнароднае права | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Замежная мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 4. Культуралогія (спецыялізацыя — амерыканістыка і англійская мова)<br>5. Культуралогія (спецыялізацыя — гебраістыка і англійская мова) | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Англійская мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 6. Культуралогія (спецыялізацыя — германістыка і нямецкая мова) | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Нямецкая мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 7. Сусветная эканоміка<br>8. Менеджмент (спецыялізацыя — менеджмент у сферы міжнароднага турызму)<br>9. Мытная справа | 1. Матэматыка (ЦТ)<br>2. Замежная мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 10. Сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — пераклад) | 1. Англійская мова (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ**<br>1. Дызайн (напрамак — дызайн прадметна-прасторавых комплексаў) | 1. Творчасць (1 этап — малюнак, 2 этап — вольная кампазіцыя)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 2. Сацыяльная работа (спецыялізацыя — сацыя-медыка-псіхалагічная дзейнасць) | 1. Біялогія (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 3. Менеджмент (спецыялізацыі — кіраванне персаналам, менеджмент нерухомай маёмасці) | 1. Матэматыка (ЦТ)<br>2. Замежная мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 4. Правазнаўства (спецыялізацыя — прававое забеспячэнне бізнесу) | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Матэматыка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Псіхалогія (спецыялізацыя — маральна-псіхалагічнае забеспячэнне воінскай дзейнасці) | 1. Біялогія (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 2. Хімія (напрамак — радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона) | 1. Хімія (пісьмовы экзамен)<br>2. Матэматыка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 3. Журналістыка (напрамак — друкаваныя СМІ, спецыялізацыя — ваенная журналістыка) | 1. Творчасць (1 этап — творчае сачыненне, 2 этап — творчае тэсціраванне)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 4. Правазнаўства (спецыялізацыя — юрысконсульцкая работа ў ваеннай сферы) | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Матэматыка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 5. Міжнародныя адносіны (спецыялізацыя — міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы) | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Замежная мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 6. Геаграфія (спецыялізацыя — геаінфарма-цыйныя сістэмы ваеннага прызначэння) | 1. Геаграфія (пісьмовы экзамен)<br>2. Матэматыка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ**<br>1. Бізнес-адміністраванне | 1. Матэматыка (ЦТ)<br>2. Замежная мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛЫ**<br>1. Тэалогія | 1. Біблейская гісторыя (вусны экзамен)<br>2. Замежная мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| **ГУМАНІТАРНЫ ФАКУЛЬТЭТ**<br>1. Дызайн (напрамак — камунікатыўны дызайн) | 1. Творчасць (1 этап — малюнак, 2 этап — вольная кампазіцыя)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 2. Міжнародныя адносіны (спецыялізацыя — арганізацыя міжнародных сувязей) | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Замежная мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 3. Сацыялогія (спецыялізацыя — метадалогія і метады сацыялагічнага даследавання)<br>4. Сацыялогія (спецыялізацыя — сацыялогія масавых камунікацый) | 1. Чалавек. Грамадства. Дзяржава (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 5. Сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — камп'ютарная лінгвістыка)<br>6. Сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — камп'ютарнае навучанне мовам) | 1. Замежная мова (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 7. Псіхалогія (спецыялізацыя — сацыяльная псіхалогія)<br>8. Псіхалогія (спецыялізацыя — метадалогія і метады псіхалагічнага даследавання) | 1. Біялогія (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 9. Інфарматыка (спецыялізацыя — Web-дызайн і камп'ютэрная графіка) | 1. Матэматыка (ЦТ)<br>2. Фізіка (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 10. Сацыяльная работа (спецыялізацыя — медыка-сацыяльная дапамога насельніцтву) | 1. Біялогія (ЦТ)<br>2. Гісторыя Беларусі (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |
| 11. Менеджмент (спецыялізацыя — сацыяльны менеджмент) | 1. Матэматыка (ЦТ)<br>2. Замежная мова (ЦТ)<br>3. Беларуская мова або руская мова (ЦТ) |

# ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан — прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь Віктар Міхайлавіч АНІШЧЫК*

*Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 2*

*Тэл. 209-52-67; 209-51-15*

*e-mail: physdean@bsu.by; www.physics.bsu.by*



Агульная колькасць: прафесараў — 32; дацэнтаў — 69; аспірантаў — 44; магістрантаў — 13; студэнтаў — 670.

Паважаныя абітурыенты, мы сардэчна запрашаем вас на фізічны факультэт БДУ, які мае амаль паўвекавую гісторыю. Тут вас чакае шмат яскравых і запамінальных падзей, што напаўняюць студэнцкае жыццё. Але галоўнае, вы маеце магчымасць атрымаць якасную сучасную адукацыю і авалодаць самай універсальнай прафесіяй — ФІЗІК.

Лекцыі высокакваліфікаваных выкладчыкаў, вядучых навукоўцаў краіны, навуковыя лабараторыі з сучасным фізічным абсталяваннем, атмасфера творчага пошуку і ўпэўненасці ў сваіх сілах — усё гэта фізічны факультэт.

Падрыхтоўка ажыццяўляецца па спецыяльнасці "Фізіка". Выпускнікі могуць атрымаць адну з наступных кваліфікацый: "*Фізік. Даследчык*", "*Фізік. Інжынер*", "*Фізік. Выкладчык фізікі і інфарматыкі*" або "*Фізік. Менеджэр*".

Пасля заканчэння другога курса студэнты размяркоўваюцца па спецыялізацыях. На кафедрах факультэта вядзецца навучанне па розных галінах сучаснай фізічнай навукі: па фізіцы паўправаднікоў і паўправадніковых матэрыялаў, нана- і мікраэлектроніцы, праграміраванні і інфармацыйным забеспячэнні вылічальных сістэм, квантавай і оптаэлектроніцы, лазерных сістэмах і тэхналогіях, фізічнай оптыцы, ахоўных і плазменных пакрыццях і плёнках, фізіцы цвёрдага цела і матэрыялазнаўстве, ядзернай фізіцы і фізіцы ядзерных рэактараў, электронным прыборабудаванні і схематэхніцы, біяфізіцы і біятэхналогіі, энергафізіцы і нетрадыцыйных крыніцах энергіі, атамнай фізіцы і фізічных метадах пераўтварэння інфармацыі, тэарэтычнай фізіцы і іншых.

Акрамя фундаментальнай падрыхтоўкі па фізіцы і матэматыцы, асаблівая ўвага на факультэце звяртаецца на сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі і інфарматыку. Пра ўзровень адраведнай падрыхтоўкі нашых выпускнікоў красамоўна сведчыць той факт, што ў 2006 г. шмат з іх былі размеркаваны па заяўках вядучых камп'ютарных кампаній: СП ЗАТ "Міжнародны дзелавы альянс" (больш вядомае як ІВА), ЗАТ "БелХардГрупп", ЗП "ЭПАМ Сістэмз", СП ЗАТ "НаучСофт" і іншых.

Студэнты актыўна займаюцца навукова-даследчай работай. На факультэце дзейнічае каля дзесяці гурткоў па розных фізічных напрамках, чатыры студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. Па выніках сваіх навуковых даследаванняў больш за два дзесяткі студэнтаў-фізікаў кожны год атрымліваюць дыпломы, граматы, грашовыя прэміі.

Аднак жыццё на фізічным факультэце не абмяжоўваецца толькі вучобай. Дні фізіка, Дзень першакурсніка, КВЗ, іншыя святы сталі ўжо традыцыйнымі. Тут вам і тэатралізаваныя выступленні, і конкурсы, і гульні, і жарты!..

Нашы выпускнікі працуюць у навукова-даследчых інстытутах, канструктарскіх бюро, навукова-вытворчых прадпрыемствах, навучальных установах і іншых арганізацыях, у тым ліку разнастайных фірмах. Тыя, хто ў студэнцкія гады вылучаўся лепшай паспяховасцю, маюць магчымасць працаваць ці працягваць навучанне ў магістратуры і аспірантуры не толькі ў БДУ і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, але і ў замежных краінах.

Узровень адукацыі, атрыманы на факультэце, дазваляе выпускнікам лёгка адаптавацца не толькі да працы па фізіка-тэхнічным профілі, але і ў іншых галінах (арганізацыйнай, камерцыйнай, банкаўскай, выдавецкай і інш.).

Больш падрабязныя звесткі пра наш факультэт можна знайсці на нашым сайце. На старонцы "Абітурыенту" змешчана інфармацыя пра ўмовы паступлення на факультэт, пра работу вочна-завочнай школы па фізіцы і матэматыцы для абітурыентаў, а таксама шмат іншай карыснай інфармацыі.

## ДАДАТАК 2

## ПЕРАЛІК СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ (НАПРАМКАЎ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ, СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЙ), ПА ЯКІХ ПАЗАКОНКУРСНЫ ПРЫЁМ У 2007 ГОДЗЕ АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЦА НЕ БУДЗЕ

**(дзённая форма навучання)**

| Факультэты, спецыяльнасці, напрамкі спецыяльнасцей, спецыялізацыі |
|---|
| **ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ** |
| 1. Паліталогія |
| 2. Правазнаўства (акрамя выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ) |
| 3. Правазнаўства (для выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ) |
| 4. Эканамічнае права |
| **ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН** |
| 1. Міжнародныя адносіны |
| 2. Лінгвакраіназнаўства |
| 3. Міжнароднае права |
| 4. Сусветная эканоміка |
| 5. Менеджмент (спецыялізацыя — менеджмент у сферы міжнароднага турызму) |
| 6. Культуралогія (спецыялізацыя — гебраістыка і англійская мова) |
| **ДЗЯРЖАУНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ** |
| 1. Менеджмент (спецыялізацыі — кіраванне персаналам, менеджмент нерухомай маёмасці) |
| 2. Дызайн (напрамак — дызайн прадметна-прасторавых комплексаў) |
| **ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ** |
| 1. Бізнесадміністраванне |
| **ГУМАНІТАРНЫ ФАКУЛЬТЭТ** |
| 1. Дызайн (напрамак — камунікатыўны дызайн) |
| 2. Міжнародныя адносіны (спецыялізацыя — арганізацыя міжнародных сувязей) |
| 3. Менеджмент (спецыялізацыя — сацыяльны менеджмент) |
| 4. Псіхалогія (спецыялізацыя — метадалогія і метады псіхалагічнага даследавання) |
| 5. Сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — камп'ютэрная лінгвістыка) |
| 6. Сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — камп'ютэрнае навучанне мовам) |
| 7. Сацыялогія (спецыялізацыя — метадалогія і метады сацыялагічнага даследавання) |
| 8. Сацыялогія (спецыялізацыя — сацыялогія масавых камунікацый) |
| **ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ** |
| 1. Правазнаўства (спецыялізацыя — юрысконсульцкая работа ў ваеннай сферы) |
| 2. Міжнародныя адносіны (спецыялізацыя — міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы) |

**(завочная форма навучання)**

| Факультэты, спецыяльнасці, напрамкі спецыяльнасцей, спецыялізацыі |
|---|
| **ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ** |
| 1. Правазнаўства (акрамя выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ) |
| 2. Правазнаўства (для выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ) |
| **ДЗЯРЖАУНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ** |
| 1. Правазнаўства (спецыялізацыя — прававое забеспячэнне бізнесу) |




## КОНКУРС ЗАЯВАЎ І ПРАХАДНЫЯ БАЛЫ НА ДЗЁННУЮ БЮДЖЭТНУЮ ФОРМУ НАВУЧАННЯ Ў 2006 ГОДЗЕ

| № п/п | Факультэт | Назва спецыяльнасці | Конкурс | | | Прахадныя балы | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | План прыёму | Пададзена заяваў | Конкурс | Агульны | Для гарадскіх | Для вясковых |
| 1 | Біялагічны факультэт | біяэкалогія, біялогія, біялогія (напрамак — біятэхналогія) | **100** | **272** | **2,72** | | **22,2** | **22,0** |
| 2 | Ваенны факультэт | геаграфія (спецыялізацыя — геаінфармацыйныя сістэмы вайсковага прызначэння) | **16** | **25** | **1,56** | ** | | |
| 3 | Ваенны факультэт | журналістыка (напрамак — друкаваныя СМІ, спецыялізацыя — ваенная журналістыка) | **2** | **7** | **3,50** | **35,1** | | |
| 4 | Ваенны факультэт | міжнародныя адносіны (спецыялізацыя — міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы) | **11** | **26** | **2,36** | ** | | |
| 5 | Ваенны факультэт | правазнаўства (спецыялізацыя — юрысконсульцкая работа ў ваеннай сферы) | **6** | **20** | **3,33** | **208** | | |
| 6 | Ваенны факультэт | псіхалогія (спецыялізацыя — маральна-псіхалагічнае забеспячэнне вайсковай дзейнасці) | **14** | **30** | **2,14** | **176** | | |
| 7 | Ваенны факультэт | хімія (напрамак — радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона) | **12** | **20** | **1,67** | ** | | |
| 8 | Геаграфічны факультэт | геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў, геаграфія, геаграфія (напрамак — геаінфармацыйныя сістэмы), геаграфія (напрамак — гідраметэаралогія) | **100** | **196** | **1,96** | **23,2** | | |
| 9 | Геаграфічны факультэт | геаэкалогія | **10** | **31** | **3,10** | | **24,6** | **23,2** |
| 10 | Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій | дызайн (напрамак — дызайн прадметна-прасторавых комплексаў) | **10** | **126** | **12,60** | | **39,4** | **35,7** |
| 11 | Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій | менеджмент (спецыялізацыі — кіраванне персаналам, менеджмент нерухомасці) | **20** | **130** | **6,50** | | **300** | **263** |
| 12 | Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій | сацыяльная работа (спецыялізацыя — соцыя-медыка-псіхалагічная дзейнасць) | **15** | **70** | **4,67** | **266** | | |
| 13 | Гуманітарны факультэт | дызайн (напрамак — камунікатыўны дызайн) | **5** | **98** | **19,60** | | **41,7** | **36,8** |
| 14 | Гуманітарны факультэт | інфарматыка (спецыялізацыя — Web-дызайн і камп'ютарная графіка) | **5** | **22** | **4,40** | **267** | | |
| 15 | Гуманітарны факультэт | менеджмент (спецыялізацыя — сацыяльны менеджмент) | **5** | **27** | **5,40** | | **316** | **245** |
| 16 | Гуманітарны факультэт | псіхалогія (спецыялізацыя — метадалогія і метады псіхалагічнага даследавання) | **5** | **27** | **5,40** | | **271** | **228** |
| 17 | Гуманітарны факультэт | сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — камп'ютарная лінгвістыка), сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — камп'ютарнае навучанне мовам) | **10** | **48** | **4,80** | **312** | | |
| 18 | Гуманітарны факультэт | сацыяльльная работа (спецыялізацыя — медыка-сацыяльная дапамога насельніцтву) | **10** | **38** | **3,80** | **264** | | |
| 19 | Гуманітарны факультэт | сацыялогія (спецыялізацыя — сацыялогія масавых камунікацый), сацыялогія (спецыялізацыя — метадалогія і метады сацыялагічнага даследавання) | **10** | **77** | **7,70** | **274*** | | |
| 20 | Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій | бізнес-адміністраванне | **10** | **53** | **5,30** | | **306** | **280** |
| 21 | Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы | тэалогія | **20** | **32** | **1,60** | | **28,2*** | **27,1** |

Заўвага

* — паўпрахадны бал

** — залічваліся ўсе абітурыенты, якія вытрымалі ўступныя іспыты

# БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

***Дэкан факультэта — кандыдат біялагічных навук, дацэнт Уладзімір Васільевіч ЛЫСАК***
***Адрас: г.Мінск, вул. Курчатава, 10***
***Тэл. 209-58-08, 209-59-02, 209-58-05***
***Факс: 209-58-08***
***e-mail: bio@bsu.by; www.bio.bsu.by***



У цяперашні час на 9 кафедрах факультэта працуюць 74 выкладчыкі, сярод якіх 8 прафесараў, 17 дактароў навук, 40 дацэнтаў, 56 кандыдатаў навук.

Навучальны працэс на факультэце забяспечваюць 7 навукова-даследчых лабараторый, заалагічны музей, батанічны сад, гербарый, вучэбная лабараторыя вылічальнай тэхнікі і тэхнічных сродкаў навучання і вучэбна-навуковы цэнтр "Нарачанская біялагічная станцыя імя Г.Г.Вінберга".

На факультэце навучаюцца больш за 1500 студэнтаў (дзённая і завочная формы навучання), 8 магістрантаў і 35 аспірантаў.

Падрыхтоўка спецыялістаў на дзённым аддзяленні вядзецца па дзвюх спецыяльнасцях: "Біялогія" (напрамкі "навукова-педагагічная дзейнасць" і "біятэхналогія") і **"Біяэкалогія"**. Студэнты атрымліваюць адну з трох кваліфікацый: "*Біёлаг. Выкладчык біялогіі і хіміі*", "*Біёлаг-біятэхнолаг. Выкладчык біялогіі*", "*Біёлаг-эколаг. Выкладчык біялогіі і экалогіі*". На завочным аддзяленні падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па спецыяльнасцях **"Біялогія"** (навукова-педагагічны напрамак) і **"Біяэкалогія"**.



На працягу першых трох семестраў студэнты, якія атрымліваюць розныя кваліфікацыі, займаюцца паводле агульнага навучальнага плана, які прадугледжвае вывучэнне асноўных прыродазнаўчанавуковых, сацыяльна-гуманітарных і базавых біялагічных дысцыплін. Пачынаючы з чацвёртага семестра навучанне студэнтаў ажыццяўляецца па асобных навучальных планах, згодна з адпаведнай кваліфікацыяй.

За перыяд навучання студэнты атрымліваюць шырокую прафесійную падрыхтоўку, якая забяспечваецца вывучэннем у вялікім аб'ёме такіх дысцыплін біялагічнага цыкла, як батаніка, заалогія, цыталогія і гісталогія, біяхімія, біяфізіка, радыёбіялогія, фізіялогія раслін, мікрабіялогія, вірусалогія, імуналогія, біятэхналогія, ксенабіялогія, малекулярная біялогія, анатомія чалавека, біялогія індывідуальнага развіцця, біяметрыя, інфармацыйныя тэхналогіі ў біялогіі і г.д.

Падрыхтоўка студэнтаў па напрамку "Біятэхналогія" і спецыяльнасці "Біяэкалогія" прадугледжвае, акрамя таго, вывучэнне шэрага дадатковых спецыяльных дысцыплін, такіх як фармакагнозія, культываванне клетак, генная інжынерыя, селекцыя прадуцэнтаў, біябяспека, землязнаўства, хімічная экалогія, экалагічны маніторынг, экалогія чалавека і інш.

Пры падрыхтоўцы спецыялістаў на дзённым аддзяленні прадугледжана праходжанне практык: на першым і другім курсах — палявая вучэбная практыка па батаніцы і заалогіі на Валожынскай геабазе "Заходняя Беразіна" і ў вучэбна-навуковым цэнтры "Нарачанская біялагічная станцыя імя Г.Г.Вінберга"; на трэцім — вучэбная практыка па спецыялізацыі на кафедрах, у вучэбна-навуковым цэнтры "Нарачанская біялагічная станцыя", навукова-даследчых лабараторыях факультэта, навукова-даследчых інстытутах, вытворчых установах, запаведніках, батанічных садах і нацыянальных парках; на чацвёртым і пятым курсах — вытворчая і педагагічная практыкі. На завочным аддзяленні вучэбную практыку па батаніцы і заалогіі студэнты праходзяць на другім і трэцім курсах, вытворчую і педагагічную практыкі — на шостым курсе.

Выпускнікі факультэта могуць працаваць выкладчыкамі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, супрацоўнікамі навукова-даследчых інстытутаў, на прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу, фармацэўтычнай, біяхімічнай, мікрабіялагічнай і харчовай прамысловасці, у запаведніках, заказніках, нацыянальных парках, батанічных садах, на селекцыйных станцыях, у сістэме Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у сістэме Дзяржкамгідрамету і г.д.

Выпускнікі, якія выявілі схільнасць да навукова-даследчай работы і высокую эрудыцыю, атрымліваюць рэкамендацыю вучонага савета факультэта для паступлення ў магістратуру ці аспірантуру.

Прафесія біёлага — прафесія будучага. Сардэчна запрашаем на біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

# ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

***Дэкан — доктар юрыдычных навук***
***Сяргей Аляксандравіч БАЛАШЭНКА***
***Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 8***
***Тэл./факс 209-52-30 (прыёмная)***
***e-mail: law@bsu.by; www.law.bsu.by***

***Юрыдычны факультэт БДУ — гэта прэстыж, творчасць, будучыня, фундаментальныя веды, высокая прафесійная падрыхтоўка!***



Выкладчыцкі склад: 23 прафесары, 106 дацэнтаў, 57 выкладчыкаў.

Колькасць кафедраў — 10: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, грамадзянскага і сямейнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крымінальнага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, крыміналістыкі, экалагічнага і аграрнага права, паліталогіі, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці.

5 вучэбных лабараторый: заканадаўства; інфарматыкі і тэхнічных сродкаў навучання; крыміналістыкі; палітычных тэхналогій, а таксама "Юрыдычная клініка".

Больш за 2,5 тыс. студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па трох спецыяльнасцях: **«Правазнаўства»**, выпускнікам якой прысвойваецца кваліфікацыя *«юрыст»*, **«Паліталогія»** — кваліфікацыя *«юрыст-палітолаг»* і **«Эканамічнае права»** — кваліфікацыя *«юрыст з веданнем эканомікі»*. Акрамя дзённай формы навучання па спецыяльнасці «Правазнаўства» прапануецца завочная і завочная для асоб, якія атрымліваюць другую вышэйшую адукацыю.



На працягу навучання студэнты-прававеды спецыялізуюцца па 8 накірунках: арганізацыя і дзейнасць дзяржаўных органаў, гаспадарчае права, судова-пракурорска-следчая дзейнасць, адвакатура і натарыят, падатковае і банкаўскае права, параўнальнае правазнаўства, прававое забеспячэнне камерцыйнай дзейнасці, палітыка і дзяржаўнае кіраванне.

Асноўнымі вывучаемымі прадметамі на факультэце з'яўляюцца наступныя: агульная тэорыя права, канстытуцыйнае права, адміністрацыйнае права, грамадзянскае права, гаспадарчае права, крымінальнае права, крымінальна-папраўчае права, працоўнае права, фінансавае права, грамадзянскі працэс, экалагічнае права, міжнароднае публічнае права, міжнароднае прыватнае права і інш. Вывучаюцца розныя спецкурсы.

Вучэбны працэс на юрыдычным факультэце спалучае класічную форму выкладання з новымі адукацыйнымі тэхналогіямі. Факультэт забяспечаны сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, аб'яднанымі лакальнай сеткай. Студэнты могуць пры падрыхтоўцы да заняткаў, экзаменаў ці залікаў з любога камп'ютара факультэта ці з дому атрымаць па кожнай вучэбнай дысцыпліне поўную даведачную, заканадаўчую і вучэбную інфармацыю, размешчаную на сайце факультэта. Практычныя навыкі студэнты-юрысты набываюць як на вучэбных і вытворчых практыках, так і ў юрыдычнай клініцы, дзе яны даюць неабходныя кансультацыі малазабяспечаным грамадзянам краіны.

На юрыдычным факультэце створаны ўсе ўмовы для вучэбнай, навуковай і творчай дзейнасці студэнтаў. На кафедрах працуюць студэнцкія навуковыя гурткі, актыўна дзейнічае Студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя і Студэнцкі навуковы савет, праходзяць студэнцкія навуковыя канферэнцыі, конкурсы навуковых работ, працуе форум на афіцыйным сайце факультэта.

На базе юрыдычнага факультэта штогод праводзіцца Рэспубліканская юрыдычная студэнцкая алімпіяда.

Традыцыйна праводзяцца Дні факультэта. На базе музея правазнаўства працуе гісторыка-культурны цэнтр.

Фонд бібліятэкі юрыдычнага факультэта налічвае каля 300 тысяч экзэмпляраў выданняў, у тым ліку і унікальных (XIX — пачатак XX ст.), напісаных выдатнымі юрыстамі розных краін.

Юрыдычны факультэт з'яўляецца асноўнай часткай утворанай у БДУ сістэмы непарыўнай падрыхтоўкі юрыдычных кадраў, якая забяспечвае атрыманне сярэдняй спецыяльнай юрыдычнай адукацыі на базе юрыдычнага каледжа БДУ, вышэйшай юрыдычнай адукацыі на юрыдычным факультэце БДУ і павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку юрыдычных кадраў на базе Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і устаноў юстыцыі БДУ.

Юрыдычны факультэт БДУ сёння з'яўляецца вядучым вучэбным і навуковым цэнтрам падрыхтоўкі кадраў прафесіяналаў-юрыстаў, здольных паспяхова вырашаць юрыдычныя задачы дзяржавы і грамадства, працаваць як у сваёй краіне, так і за яе межамі. Нашы выпускнікі працуюць ва ўсіх сферах грамадства: у заканадаўчых і выканаўчых органах улады, у судовай сістэме дзяржавы, у праваахоўных органах, адвакатуры, натарыяце, на прадпрыемствах усіх форм уласнасці. Шэраг выпускнікоў юрыдычнага факультэта займаюць кіруючыя пасады ў Адміністрацыі прэзідэнта. Шмат выхаванцаў юрыдычнага факультэта паступаюць у аспірантуру і потым паспяхова займаюцца навуковай працай. За гады існавання факультэт падрыхтаваў не адно пакаленне юрыстаў з вышэйшай адукацыяй. Сярод яго выпускнікоў міністры, дэпутаты Нацыянальнага сходу, кіраўнікі ўстаноў і арганізацый. Сёння выпускнікі факультэта ўзначальваюць Канстытуцыйны, Вярхоўны суд і Вышэйшы гаспадарчы суд, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Пракуратуру Рэспублікі Беларусь.

Конкурс на юрыдычны факультэт ў апошнія гады складаў прыкладна 3—4 абітурыенты на адно месца. Прахадны бал у 2006 годзе па выніках чатырох уступных іспытаў на бюджэтную форму навучання склаў 266 (з 400) балаў. Сярод тых, хто паступіў, збольшага прадстаўнікі з розных рэгіёнаў Беларусі (61%), што сведчыць пра вялікую папулярнасць нашага факультэта.

Дыплом юрфака БДУ — гэта гарантыя паспяховай кар'еры і максімальнай самарэалізацыі!

# ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ

**Дэкан — дацэнт, кандыдат фізіка-матэматычных навук, прарэктар БДУ па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях**
**Павел Аляксеевіч МАНДРЫК**
**Адрас: г. Мінск, пpacп. Незалежнасці, 4**
**Тэл. 209-52-45, факс 226-55-48**
**e-mail: dekanat_FPMI@bsu.by; www.fpmi.bsu.by**



Дата заснавання: 1 красавіка 1970 г.

Выкладчыцкі састаў зараз налічвае больш за 150 чалавек, сярод якіх 25 прафесараў і дактароў навук, больш за 100 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

На факультэце дзейнічаюць 11 кафедраў.

Усяго навучаюцца больш за 1200 студэнтаў.

За час свайго існавання факультэт падрыхтаваў каля 8000 спецыялістаў, якія складаюць кадравую аснову многіх вядучых арганізацый краіны ў галіне інфармацыйных тэхналогій і адпаведных падраздзяленняў прамысловых прадпрыемстваў, навуковых установаў, банкаў, страхавых кампаній, навучальных установаў.

Прапануемыя спецыяльнасці:

**"прыкладная матэматыка"** (кваліфікацыя "*матэматык-праграміст*");

**"інфарматыка"** (кваліфікацыя "*матэматык, сістэмны праграміст*");

**"эканамічная кібернетыка"** (кваліфікацыя "*матэматык-эканаміст*");

**"актуарная матэматыка"** (кваліфікацыя "*матэматык-фінансіст*");

**"камп'ютарная бяспека"** (кваліфікацыя "*матэматык, спецыяліст па абароне інфармацыі*").



Незалежна ад спецыяльнасці выпускнікі факультэта могуць займацца праблемна-аналітычнай, навукова-даследчай, арганізацыйна-кіраўніцкай і практычнай дзейнасцю, звязанай з праектаваннем, распрацоўкай, эксплуатацыяй і суправаджэннем прыкладнога і сістэмнага праграмнага забеспячэння.

*Матэматык-праграміст* — спецыяліст у галіне прымянення сучасных матэматычных метадаў ва ўсіх сферах чалавечай жыццядзейнасці і пабудовы рашэнняў з дапамогай сучасных ЭВМ. Ён здольны выводзіць матэматычныя мадэлі з'яваў, працэсаў і сістэм у навуцы, тэхніцы, эканоміцы, на вытворчасці і ў кіраўніцтве; распрацоўваць праграмнае забеспячэнне і рэалізоўваць яго на сучаснай вылічальнай тэхніцы; апрацоўваць, аналізаваць і інтэрпрэтаваць атрыманыя вынікі, рыхтаваць ці прымаць кіраўніцкія рашэнні.

*Матэматык, сістэмны праграміст* — спецыяліст у галіне прымянення і стварэння розных сродкаў, сетак, баз даных, праграмнага забеспячэння. Ён здольны праводзіць тэарэтычныя і прыкладныя даследаванні ў галіне сістэмнага праграміравання; распрацоўваць новыя метады, сістэмы і сродкі забеспячэння камп'ютарных тэхналогій.

*Матэматык-эканаміст* — спецыяліст па прымяненні сучасных матэматычных метадаў, рэалізацыі мадэляў, пабудовы і аналізу рашэнняў у эканоміцы з дапамогай сучасных ЭВМ. Ён здольны будаваць і выкарыстоўваць мадэлі для апісання і прагназавання разнастайных эканамічных з'яваў, ажыццяўляць іх колькасны і якасны аналіз; выкарыстоўваць камп'ютарныя метады збору, захоўвання і апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

*Матэматык-фінансіст* — спецыяліст у галіне сучасных матэматычных метадаў, рэалізацыі мадэляў, пабудовы і аналізу рашэнняў у фінансавай сферы з дапамогай сучасных ЭВМ. Ён здольны займацца дастасаваннем матэматыкі да пытанняў, звязаных з рызыкай і няпэўнасцю, быць экспертам у вырашэнні праблем, звязаных з няпэўнасцю ў галіне фінансаў і бізнесу, даваць матэматычна абгрунтаваныя парады кіраўнікам у сферы фінансавай бяспекі.

*Матэматык, спецыяліст па абароне інфармацыі* — спецыяліст у галіне камп'ютарнай бяспекі і абароны інфармацыі. Ён можа весці тэарэтычныя і прыкладныя даследаванні ў адпаведнай галіне, распрацоўваць перспектыўныя праграмныя метады, тэхналогіі, сродкі і сістэмы забеспячэння камп'ютарнай бяспекі.

Студэнцкае жыццё факультэта насычана рознымі падзеямі. Напярэдадні дня нараджэння факультэта (1 красавіка) адбываюцца "Дні ФПМІ". Праграма свята ўключае забаўляльныя і спартыўныя конкурсы, спаборніцтвы і г.д., у якіх студэнты ўдзельнічаюць разам з выкладчыкамі. Канцэрты факультэцкіх тэатра мініяцюр і каманды КВЗ адбываюцца ў дні студэнцкіх святаў: Дня першакурсніка, Дня студэнта, Дня універсітэта, Дня святога Валянціна і г.д. Аператыўныя навіны можна прачытаць у штомесячнай газеце "ФПМы" і на сайце факультэта.

Іншагароднім студэнтам даецца месца ў інтэрнаце № 6, дзе традыцыйна жывуць толькі выхаванцы нашага факультэта. У гэтым інтэрнаце існуе сертыфікаваная камп'ютарная сетка, якая дазваляе проста з пакоя падключаць два камп'ютары да адукацыйных сервераў факультэта з выхадам у Інтэрнэт. Летась у гарадскім конкурсе інтэрнат № 6 заняў першае месца сярод інтэрнатаў ВНУ краіны.

На факультэце дзейнічае сістэма бесперапыннай адукацыі, арыентаванай на прадметы "матэматыка" і "інфарматыка". Сістэма ўключае пастаянна дзеючыя школы юных (вочную і вочна-завочную, пачынаючы з 5-га класа школы) і разнастайныя мерапрыемствы алімпіядна-конкурснага і навучальнага характару (алімпяды, канферэнцыі, зборы рознага ўзроўню і накіраванасці, летнія школы і г.д.).

Запрашаем усіх зацікаўленых на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, а навучэнцаў 5—10-х класаў — у нашы школы юных, а таксама ў цэнтр па рабоце з адоранымі школьнікамі ("ЮНІ-цэнтр-XXI").

# ГУМАНІТАРНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**Дэкан — кандыдат тэхнічных навук, дацэнт**
**Уладзімір Яўгенавіч ГУРСКІ**
**Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 5**
**Тэл. 209-59-11, 209-59-08**
**e-mail: hurski@bsu.by**

На гуманітарным факультэце адбываецца падрыхтоўка спецыялістаў па наступных спецыяльнасцях:

— **міжнародныя адносіны** (спецыялізацыя — арганізацыя міжнародных сувязяў);

— **дызайн** (напрамак — камунікатыўны дызайн);

— **сучасныя замежныя мовы** (спецыялізацыі — камп'ютарная лінгвістыка і камп'ютарнае навучанне мовам);

— **інфарматыка** (спецыялізацыя — WEB-дызайн і камп'ютарная графіка);

— **псіхалогія** (спецыялізацыі — сацыяльная псіхалогія і метадалогія і метады псіхалагічнага даследавання);

— **сацыялогія** (спецыялізацыі — сацыялогія масавых камунікацый і метадалогія і метады сацыялагічнага даследавання);

— **сацыяльная работа** (соцыямедыка-псіхалагічная дзейнасць);

— **менеджмент** (спецыялізацыя — сацыяльны менеджмент).

Гуманітарны факультэт забяспечвае падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў якасна новага ўзроўню. На ўсіх спецыяльнасцях студэнты паглыблена знаёмяцца з камп'ютарнымі тэхналогіямі, што выклікана ростам ролі камп'ютараў і тэхнічных сродкаў пры арганізацыі дзейнасці любога спецыяліста. Таксама студэнты паглыблена вывучаюць замежныя мовы, што абумоўлена працэсамі глабалізацыі, неабходнасцю актывізаваць узаемадзеянне з замежнымі партнёрамі.

Выпускніку спецыяльнасці "Міжнародныя адносіны" надаецца кваліфікацыя "спецыяліст па міжнародных адносінах з веданнем замежнай мовы". Высокакваліфікаваныя спецыялісты валодаюць сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі і маюць шырокія веды ў знешнепалітычнай сферы. Выпускнікі гэтай спецыяльнасці змогуць прымяняць свае веды ў галіне арганізацыі знешнеэканамічных сувязяў. Гэта дае ім магчымасць працаваць спецыялістамі аддзелаў і ўпраўленняў па знешнеэканамічных сувязях арганізацый і прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці.

Пры падрыхтоўцы дызайнераў асаблівая ўвага надаецца безаналагаваму інавацыйнаму праектаванню, развіццю навыкаў творчага падыходу да праектавання штучнага асяроддзя. Асаблівасць гэтай методыкі — у прыцягненні абітурыентаў, якія маюць нязначную падрыхтоўку ў традыцыйнай выяўленчай грамаце, але здольныя праектна мысліць. Сферы прафесійнай дзейнасці — вытворчыя, навукова-даследчыя, праектныя, творчыя, адукацыйныя ўстановы, арганізацыі і прадпрыемствы розных формаў уласнасці, якія ажыццяўляюць дызайн-распрацоўкі, і г.д. Спецыяліст у галіне дызайну мае права займаць такія пасады, як мастак-канструктар (дызайнер), мастак, мастак па рэкламе і афармленні вітрын.

Будучыя спецыялісты па камп'ютарным навучанні мовам змогуць не толькі выкладаць замежную мову, але і самі станавіцца аўтарамі камп'ютарных курсаў па навучанні мове. Падчас падрыхтоўкі спецыялісты засвойваюць замежныя мовы і вывучаюць праграміраванне і псіхалагічныя дысцыпліны. Пасля паспяховага заканчэння БДУ яны могуць займаць наступныя пасады: выкладчык, малодшы навуковы супрацоўнік, перакладчык, рэдактар-перакладчык, рэдактар-стыліст і інш.

Спецыялізацыя "WEB-дызайн і камп'ютарная графіка" прадугледжвае не толькі падрыхтоўку прафесійных праграмістаў, але і спецыялістаў у галіне камп'ютарнай графікі і WEB-дызайну. Акрамя асноўных дысцыплін праграміравання ў пералік спецкурсаў уваходзяць дысцыпліны мастацкай накіраванасці кшталту "Тэорыі і метадалогіі дызайну", "Псіхалогіі ўспрымання візуальнай інфармацыі", "Колеразнаўства і каларыстыкі" і інш. Спецыяліст можа займаць такія пасады, як інжынер-праграміст, матэматык, інжынер-даследчык, малодшы навуковы супрацоўнік і інш.



Пры навучанні спецыялістаў па псіхалогіі і сацыялогіі асноўная ўвага надаецца падрыхтоўцы спецыялістаў-практыкаў. Спецыяліст, які мае кваліфікацыю "Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі", можа займаць пасады псіхолага-кансультанта, школьнага псіхолага, медыцынскага псіхолага, выкладчыка псіхалогіі.

Вядзецца падрыхтоўка сучасных сацыяльных работнікаў, спецыялістаў, якія маюць высокую медыка-псіхалагічную кампетэнцыю, спецыяльныя веды ў галіне сацыяльнай інжынерыі і тэхналогіі, прававых, псіхалагічных і маральных асаблівасцях жыццядзейнасці чалавека. Сфера прафесійнай дзейнасці — дзяржаўныя і недзяржаўныя сацыяльныя службы, арганізацыі і ўстановы сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва, адукацыі, аховы здароўя, войска, праваахоўных органаў і г.д. Спецыяліст у галіне сацыяльнай работы мае права займаць такія пасады, як сацыяльны педагог, сацыяльны псіхолаг, навуковы супрацоўнік, інструктар па працоўнай тэрапіі, інспектар па ахове дзяцінства, інструктар па арганізацыйна-масавай рабоце, выхавальнік інтэрната, кансультант у сферы прафесійнага адбору.

Менеджмент сацыяльнай сферы — новы від міждысцыплінарнай прафесійнай дзейнасці. У аснове яго ляжыць кіраўніцкае эканамічнае забеспячэнне пры арганізацыі медыка-сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Менеджэр-эканаміст — гэта спецыяліст шырокага профілю з рознабаковай эканамічнай і прававой падрыхтоўкай. Аб'ектамі яго прафесійнай дзейнасці з'яўляюцца навукова-даследчыя арганізацыі, кансультацыйныя фірмы, аналітычныя падраздзяленні ўстановаў і прадпрыемстваў розных арганізацыйна-прававых формаў, у тым ліку органаў сацыяльнай абароны, аховы здароўя, адукацыі, сферы паслуг.

# ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**Дэкан факультэта — прафесар, доктар геаграфічных навук Іван Іванавіч ПІРОЖНІК**
**Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16**
**Тэл. 209-52-57, факс 209-50-15**
**e-mail: geo@bsu.by**



Выпускнікі факультэта могуць атрымаць наступныя ква-ліфікацыі "*Географ. Выкладчык геаграфіі*" (напрамак "Геаграфія", навукова-педагагічная дзейнасць), "*Географ. Гідраметэаролаг*" (напрамак "Геаграфія (гідраметэаралогія)"), "*Географ-эколаг. Выкладчык геаграфіі і экалогіі*" (спецыяльнасць "Геаэкалогія"), "*Інжынер-геолаг*" (спецыяльнасць "Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў"), "*Географ. Спецыяліст па геаінфармацыйных сістэмах*" (напрамак "ГІС").

На геаграфічным факультэце існуюць наступныя спецыяльнасці і спецыялізацыі:

**Геаграфія**. Спецыялізацыі: фізічная геаграфія; геаграфія турызму і экскурсійны менеджмент; эканамічная геаграфія; дэмаграфія; геаграфія глебаў, зямельныя рэсурсы і меліярацыя; картаграфія; рэгіянальная сацыяльна-эканамічная геаграфія; рацыянальнае прыродакарыстанне і ахова прыроды.



Напрамак "Геаінфармацыйныя сістэмы".

Напрамак "Геаграфія (гідраметэаралогія)". Спецыялізацыі: гідралогія сушы; метэаралогія.

**Геаграфічная экалогія**. Спецыялізацыі: ахова навакольнага асяроддзя і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў; маніторынг навакольнага асяроддзя.

**Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў.** Спецыялізацыі: геалагічныя здымкі, пошук і разведка радовішчаў карысных выкапняў; тэктоніка і фізіка Зямлі.

На I і II курсах студэнты вывучаюць цыкл сацыяльна-гуманітарных і прыродазнаўчых (фізіка, хімія, вышэйшая матэматыка, астраномія і інш.) дысцыплін, а таксама вялікую колькасць спецыяльных (агульнае землязнаўства, агульная геалогія, глебазнаўства і геаграфія глебаў, метэаралогія і кліматалогія, гідралогія, біягеаграфія, геадэзія і картаграфія, геаграфія сусветнай гаспадаркі, геаграфія насельніцтва, праблемы фізічнай і эканамічнай геаграфіі ды інш.). Па заканчэнні тэарэтычнага навучання студэнты I і II курсаў праходзяць вучэбную практыку, а на III і IV курсах — вытворчую. Для правядзення палявых практык створана вучэбная геаграфічная станцыя "Заходняя Бярэзіна" (Валожынскі раён Мінскай вобласці). Міжрэгіянальная вучэбная практыка пасля II курса праходзіць у розных прыродна-гаспадарчых рэгіёнах Беларусі (Паазер'е, Палессе, Прыдняпроўе і інш.).

Будучыя спецыялісты-геолагі атрымліваюць практычныя навыкі падчас вытворчых практык на прадпрыемствах ВА "Белгеалогія", павышаюць сваю кваліфікацыю ў шчыльным кантакце з навукоўцамі Інстытута геафізікі і геахіміі НАНБ і Беларускага навукова-даследчага інстытута геолага-разведачных пошукаў (БелНДІГРП).

Кваліфікацыя "*Географ. Спецыяліст па ГІС*" адкрывае шырокія магчымасці для атрымання тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі па комплексе дысцыплін, неабходных пры распрацоўцы і прымяненні інфармацыйных тэхналогій.

Пасля заканчэння універсітэта геаэколагі могуць працаваць у структурных падраздзяленнях Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у навукова-даследчых і праектных інстытутах, а таксама выкладаць геаграфію і экалогію ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах.

Інжынеры-геолагі працуюць у структурных падраздзяленнях Дэпартамента па геалогіі, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, экспедыцыях РУП "Белгеалогія", у навукова-даследчых і праектных інстытутах.

Выпускнікі спецыялізацыі ГІС размяркоўваюцца ў сістэму Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі, яго тэрытарыяльных органаў, у падведамасныя навуковых, вытворчыя, навучальныя прадпрыемствы і арганізацыі ("Белгеадэзія", "Белкартаграфія", "Белгіпразем").

Спецыялісты-гідраметэаролагі пройдуць падрыхтоўку для працы ў сістэме Дэпартамента гідраметэаралогіі і яго падраздзяленняў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у навуковых і вытворчых прадпрыемствах і ўстановах.

# ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН

**Дэкан — доктар юрыдычных навук, прафесар, Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Віктаравіч ШАРАПА**
**Адрас: г. Мінск, вул. Акадэмічная, 25**
**Тэл./факс 284-00-04, 284-26-82**
**e-mail: fir@bsu.by; www.fir.bsu.by**



**Спецыяльнасць "Міжнародныя адносіны"**

Падрыхтоўка па гэтай спецыяльнасці прадугледжвае вывучэнне сучаснай міжнароднай палітыкі і эканомікі, базавых прынцыпаў і напрамкаў знешняй палітыкі Беларусі, асаблівасцяў палітычнага развіцця і знешнепалітычнага курса іншых краін. Студэнты паглыблена вывучаюць дзве замежныя мовы, сярод якіх не толькі еўрапейскія, але і кітайская, японская, арабская, фарсі, турэцкая і інш. Выпускнікам надаецца кваліфікацыя "*Спецыяліст па міжнародных адносінах. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем дзвюх замежных моваў)*". Яны працуюць у Міністэрстве замежных спраў, іншых міністэрствах і ведамствах Беларусі, прадстаўніцтвах міжнародных арганізацый і замежных кампаній, сродках масавай інфармацыі і грамадскіх арганізацыях, а таксама знешнегандлёвых падраздзяленнях арганізацый рознай формы ўласнасці.

**Спецыяльнасць "Менеджмент"**

Папулярнасць гэтай спецыяльнасці сярод моладзі расце з кожным годам. У параўнанні з 1998 г. колькасць студэнтаў на аддзяленні вырасла ў 10 разоў. Выпускнікі атрымліваюць унікальную кваліфікацыю — "*менеджэр-эканаміст у сферы міжнароднага турызму. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем моваў)*". Гэта дае ім магчымасць працаваць у турыстычнай індустрыі, банкаўскай сферы, знешнеэканамічных падраздзяленнях прадпрыемстваў і арганізацый краіны. Усе студэнты-бюджэтнікі маюць гарантаванае месца працы.

Студэнты атрымліваюць трывалыя веды па найважнейшых галінах турбізнесу. Яны вывучаюць такія дысцыпліны, як "Эканамічная і сацыяльная геаграфія замежных краін", "Міжнародная гатэльная гаспадарка", "Эканоміка міжнароднага турызму" і г.д. Вучэбна-вытворчую практыку студэнты праходзяць у вядомых турфірмах кшталту "Алатан-тур", "SMOK" і інш.

**Спецыяльнасць "Міжнароднае права"**

Спецыялізацыі: міжнароднае публічнае права, міжнароднае прыватнае права, еўрапейскае права.

Выпускнікам гэтай спецыяльнасці надаецца кваліфікацыя "*юрыст-міжнароднік з веданнем замежных моваў*". Гэта спецыялісты шырокага юрыдычнага профілю, якія маюць уяўленне пра цяперашні сусветны правапарадак, могуць лагічна і адукавана выказваць і абгрунтоўваць уласныя меркаванні наконт міжнародна-прававой праблематыкі, свабодна валодаюць сучаснымі метадамі аналізу і вырашэння прававых праблем. Найбольшую запатрабаванасць выпускнікі адчуваюць у сістэме органаў дзяржаўнай улады і кіравання, а таксама ў міжнародных арганізацыях і ўстановах.

**Спецыяльнасць "Сусветная эканоміка"**

Падчас падрыхтоўкі ў гэтай галіне студэнты вывучаюць механізм функцыянавання сусветнай эканомікі і міжнародных эканамічных адносін, міждзяржаўнай і рэгіянальнай палітыкі, а таксама дзейнасць міжнародных арганізацый. Гэтыя веды дазволяць ім працаваць у міждзяржаўных органах, замежных прадстаўніцтвах, міжнародных фінансава-эканамічных арганізацыях, навукова-даследчых інстытутах, установах адукацыі, а таксама міністэрствах і ведамствах, якія займаюцца распрацоўкай і правядзеннем макраэканамічнай і знешнеэканамічнай палітыкі. Выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю "*эканаміст*" з дадатковым сертыфікатам "рэферэнт-перакладчык".

**Спецыяльнасць "Лінгвакраіназнаўства"**

Лінгвакраіназнаўства — спецыяльнасць, прызначаная для падрыхтоўкі спецыялістаў шырокага профілю па ўсходазнаўчых дысцыплінах.

Студэнты атрымліваюць глыбокую тэарэтычную і практычную падрыхтоўку па ўсходняй мове, гісторыі, палітыцы, эканоміцы, геаграфіі і культуры краіны вывучаемай мовы: сюды ўваходзяць Кітай, Японія, Карэя, Турцыя, Іран і арабскія краіны.

Спецыяльнасць "Лінгвакраіназнаўства" рыхтуе спецыялістаў на ўзроўні сусветных стандартаў для забеспячэння адпаведнымі кадрамі дзяржаўных і камерцыйных структур. На сённяшні дзень ніводная вышэйшая навучальная ўстанова Беларусі такіх спецыялістаў не рыхтуе. Выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю "*Усходазнаўца-міжнароднік. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем моваў зносін)*", што дазваляе ім паспяхова канкураваць з выпускнікамі вузкаспецыялізаваных навучальных устаноў. Такія спецыялісты могуць працаваць не толькі перакладчыкамі, але і кансультантамі па краіне і рэгіёне, а таксама выкладчыкамі рускай мовы як замежнай.

**Спецыяльнасць: "Мытная справа"**

Спецыялізацыі: прававое забеспячэнне мытнай дзейнасці, эканамічнае забеспячэнне мытнай дзейнасці.

Падрыхтоўка спецыялістаў мытнай справы на ўзроўні ВНУ ажыццяўляецца ўпершыню ў гісторыі Беларусі. Спецыяльнасць была адкрыта ў 1999 г. Аснову падрыхтоўкі складаюць агульнапрафесійныя спецыяльныя дысцыпліны. Студэнты таксама атрымліваюць спецыяльныя веды па вядзенні знешнегандлёвай, фінансавай і валютна-крэдытнай дзейнасці. Выпускнікам надаецца кваліфікацыя "*Спецыяліст мытнай справы*". Іх веды патрэбныя ў мытных органах, розных дзяржаўных і камерцыйных структурах, якія ажыццяўляюць знешнеэканамічныя сувязі.

**Спецыяльнасць: "Культуралогія"**

Спецыяльнасць дае веды ў галіне тэорыі і гісторыі культуры, тэорыі і гісторыі мастацтва, тэорыі і гісторыі літаратуры. Студэнты паглыблена вывучаюць замежную мову (з правам выкладання англійскай і нямецкай моваў), а таксама атрымліваюць добрыя веды па амерыканскай, нямецкай і ўэльскай культуры, літаратуры і гісторыі. Спецыяльнасць прадугледжвае выкладчыцкую і культурна-асветную дзейнасць у любых адукацыйных установах у якасці выкладчыка культуралогіі і сусветнай мастацкай культуры, а таксама шырокага спектра сацыягуманітарных (гістарычных, філалагічных, філасофскіх) дысцыплін. Выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю "*Культуролаг-даследчык. Выкладчык*" і будуць запатрабаваныя ў сферы педагагічнай, культурна-асветнай, навукова-даследчай, праектна-аналітычнай, арганізацыйна-кіраўніцкай работы.

**Спецыяльнасць: "Сучасныя замежныя мовы"**

Аснову спецыяльнасці складае глыбокае вывучэнне тэорыі і практыкі замежных моваў, тэорыі і практыкі перакладу, асноваў сінхроннага перакладу, спецфілалогіі, лексікалогіі, стылістыкі, мовы СМІ, дзелавой мовы, методыкі выкладання замежных моваў і асноваў міжкультурных зносін.

Кваліфікацыйная характарыстыка выпускнікоў — "*Лінгвіст, перакладчык (з указаннем моваў)*" — мае на ўвазе, што яны могуць у вызначаным парадку ажыццяўляць прафесійную дзейнасць у сферы лінгвістычнай адукацыі і міжкультурнай камунікацыі. Сёння нашы выпускнікі паспяхова працуюць у аддзеле перакладаў Гандлёва-прамысловай палаты Расіі, вытворчым аб'яднанні "Нарыльскі нікель", Беларускай вайсковай акрузе, навукова-вытворчых і турыстычных кампаніях Беларусі.

# ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**Дэкан — прафесар, доктар хімічных навук**
**Уладзімір Уладзіміравіч ПАНЬКОЎ**
**Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14**
**Тэл. 226-49-98, 200-69-18, 209-52-53**
**e-mail: chem@bsu.by; www.chemistry.bsu.by**



Хімічны факультэт адзіны ў краіне вядзе падрыхтоўку спецыялістаў-хімікаў найвышэйшай кваліфікацыі. За 75 гадоў яго дзейнасці было падрыхтавана больш за 7000 хімікаў. Выпускнікі факультэта працуюць у Нацыянальнай акадэміі навук, навукова-даследчых і праектных інстытутах, шматлікіх ВНУ, у тым ліку ва ўсіх універсітэтах нашай краіны, на многіх прамысловых прадпрыемствах хімічнага профілю. Вялікая колькасць хімікаў-даследчыкаў і хімікаў-педагогаў працуе за мяжой у вядучых установах і фірмах хімічнага профілю.

Хімічны факультэт сёння — гэта сем кафедраў (аналітычнай, неарганічнай, арганічнай, фізічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, хіміі высокамалекулярных злучэнняў, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі). У навучальным працэсе задзейнічаны 24 дактары і 64 кандыдаты навук. Вядзецца інтэнсіўная навуковая работа. Факультэт шчыльна супрацоўнічае з НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ, інстытутамі НАН Беларусі, у якіх студэнты ў рамках спецыяльных курсаў знаёмяцца з самымі перадавымі даследаваннямі, выконваюць курсавыя і дыпломныя работы, удзельнічаюць у выкананні навуковых тэм.



Падрыхтоўка спецыялістаў ажыццяўляецца па спецыяльнасці "Хімія" (1- 05 01) па чатырох напрамках: навукова-вытворчая дзейнасць (1-31 05 01-01), навукова-педагагічная дзейнасць (1-31 05 01-02), фармацэўтычная дзейнасць (1-31 05 01-03) і ахова навакольнага асяроддзя (1-31 05 01-04). Пасля заканчэння навучання выпускнікі атрымліваюць адну з чатырох кваліфікацый: "*Хімік. Даследчык*", "*Хімік. Выкладчык хіміі*", "*Хімік. Хімік-эколаг*" і "*Хімік. Хімік-фармацэўт*". Двайная кваліфікацыя дае права кожнаму выпускніку займацца як навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне хіміі, так і працаваць па больш вузкай спецыяльнасці ў залежнасці ад абранага напрамку. Студэнты навукова-вытворчага і навукова-педагагічнага напрамкаў маюць магчымасць з трэцяга курса выбіраць больш вузкую спецыялізацыю: аналітычная хімія, неарганічная хімія, арганічная хімія, фізічная хімія, хімія высокамалекулярных злучэнняў, хімія цвёрдага цела і паўправаднікоў, энергазберажэнне ў хімічнай тэхналогіі. Гэта дазваляе асвоіць самыя перспектыўныя спецыяльнасці для далейшага кар'ернага, навуковага і навукова-педагагічнага росту.

Навучальны працэс на факультэце скіраваны не толькі і не столькі на засваенне студэнтамі пэўнага аб'ёму ведаў, колькі на развіццё іх творчага патэнцыялу, умення самастойна будаваць сваю адукацыйную траекторыю, пастаянна папаўняць і абнаўляць сваю прафесійную кампетэнцыю. Сведчаннем гэтага служыць той факт, што многія выпускнікі-хімікі нашага факультэта сталі банкірамі, дыпламатамі, крыміналістамі, кіраўнікамі, менеджэрамі, г.зн. лёгка ўвайшлі ў розныя па сваёй сутнасці прафесіі і сферы дзейнасці і дасягнулі ў іх значных поспехаў.

Для паспяховага навучання факультэт мае ўсё неабходнае: дастатковую колькасць аўдыторый, сучасныя вучэбныя лабараторыі, два камп'ютарныя класы, уласную бібліятэку. Вядома, акрамя навучальнага працэсу ёсць вольны час і зацікаўленасці. Можна займацца спортам, танцаваць, спяваць, удзельнічаць у пастаноўках студэнцкага тэатра. А чаго варта грандыёзнае веснавое свята "Дзень хіміка"! Для многіх яно дае магчымасць адкрыць сваё "Я", знайсці новых сяброў, атрымаць цудоўныя ўражанні. Вось такая цікавая старонка ёсць у студэнцкім "хімічным" жыцці.

Навучальны працэс непарыўна звязаны з навукова-даследчай работай выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта і на старэйшых курсах працягваецца ў навуковых лабараторыях і даследчых цэнтрах факультэта. Падчас выканання курсавых і дыпломных работ студэнты могуць удзельнічаць у навуковых даследаваннях разам са сваімі кіраўнікамі.

Пасля заканчэння факультэта выпускнікі маюць шырокія магчымасці ў выбары далейшага поля сваёй прафесійнай дзейнасці і дасягненні хуткага кар'ернага росту. Гэта навукова-даследчыя інстытуты Нацыянальнай акадэміі навук, даследчыя і інжынерныя цэнтры прамысловых прадпрыемстваў, хімічныя лабараторыі буйных прамысловых аб'яднанняў хімічнага профілю, прадпрыемствы радыёэлектроннай і фармацэўтычнай прамысловасці, а таксама ўсюды, дзе выкарыстоўваюцца хімічныя тэхналогіі. А без гэтых тэхналогій сёння цяжка ўявіць сабе якое-небудзь паспяховае дзяржаўнае ці прыватнае прадпрыемства не толькі нашай краіны, але і ўсялякай іншай. Людзі, схільныя да выкладчыцкай дзейнасці, могуць рэалізаваць сябе ў галіне выкладання хіміі ў вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і сярэдніх навучальных установах сістэмы народнай адукацыі. І не толькі ў Беларусі.

Найлепшыя выпускнікі факультэта маюць магчымасць працягнуць адукацыю ў магістратуры і аспірантуры па спецыяльнасці 1-35 01 01 "Хімія". Гэта адкрывае яшчэ больш шырокія далягляды для актыўнай творчай дзейнасці ў будучыні.

Мы чакаем вас на хімічным факультэце і перакананыя, што, прыйшоўшы навучацца да нас, вы не пашкадуеце пра свой выбар.

# ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК

**Дэкан факультэта — доктар сацыялагічных навук,**
**прафесар Анатоль Уладзіміравіч РУБАНАЎ**
**Адрас: г. Мінск, вул. К.Маркса, 31**
**Тэл./факс 227-60-25**
**e-mail: phse@bsu.by; www.ffsn.bsu.by**



Факультэт філасофіі і сацыяльных навук уключае 4 аддзяленні дзённай формы навучання — філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі, інфармацыі і камунікацыі (сацыяльныя тэхналогіі) і 2 аддзяленні завочнай формы навучання — філасофіі і сацыялогіі.

На аддзяленні **філасофіі** вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па наступных спецыялізацыях: анталогія і тэорыя пазнання, сацыяльная філасофія, філасофія культуры.

Студэнты гэтага аддзялення маюць грунтоўную агульнаадукацыйную падрыхтоўку ў галіне прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных навук, авалодваюць значнымі ведамі па гісторыі філасофіі і культуры, логіцы, псіхалогіі, шырокім коле напрамкаў сучаснай філасофіі. Напрыканцы яны атрымліваюць кваліфікацыю "*Філосаф. Выкладчык філасофіі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*" і знаходзяць дастасаванне сваім ведам у вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і сярэдніх навучальных установах, навукова-даследчых і аналітычных цэнтрах, грамадскіх аб'яднаннях, органах дзяржаўнага кіравання.

На аддзяленні сацыялогіі вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па наступных спецыялізацыях: тэарэтычная сацыялогія; метадалогія і метады сацыялагічнага даследавання; сацыялогія кіравання. Студэнты авалодваюць комплексам сацыялагічных дысцыплін агульнага і спецыяльнага характару. Вялікая ўвага надаецца вывучэнню дысцыплін матэматычнага цыкла, агульнай і сацыяльнай псіхалогіі. Спецкурсы прысвячаюцца вывучэнню праблем працы, кіравання, выхавання, культуры, адукацыі і г.д. Выпускнікі аддзялення атрымліваюць кваліфікацыю "*Сацыёлаг. Выкладчык сацыялогіі і сацыяльна-палітычных дысцыплін*" і могуць працаваць у сацыялагічных і маркетынгавых службах, рэкламных агенцтвах і аддзелах па сувязях з грамадскасцю дзяржаўных і недзяржаўных устаноў, аналітычных і навукова-даследчых цэнтрах, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах.

Аддзяленне **псіхалогіі** забяспечвае падрыхтоўку па спецыялізацыях "медыцынская псіхалогія" і "сацыяльная псіхалогія".

Тут студэнты праходзяць базавую псіхалагічную падрыхтоўку, якая ўключае ўсе асноўныя дысцыпліны псіхалагічнага цыкла: агульная, сацыяльная, медыцынская, узроставая, педагагічная, інжынерная псіхалогія, псіхалогія індывідуальных адрозненняў і г.д. Прадугледжана паглыбленае засваенне сусветных педагагічных традыцый. Выпускнікі аддзялення атрымліваюць кваліфікацыю "*Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі*".

Медыцынскія псіхолагі таксама атрымліваюць спецыяльныя веды па нейрапсіхалогіі, псіхасаматыцы, псіхафармакалогіі, псіхалогіі адхіляючыхся паводзін, анамаліях псіхічнага развіцця дзіцяці, яго дыягностыцы і карэкцыі. Такія спецыялісты могуць працаваць медыцынскімі псіхолагамі ў разнастайных кансультацыйных службах, лячэбных установах і крызісных цэнтрах; псіхолагамі-кансультантамі — у сацыяльна-педагагічных, псіхалагічных і медыка-псіхалагічных службах дапамогі насельніцтву; навуковымі супрацоўнікамі і выкладчыкамі псіхалогіі.

Сацыяльныя псіхолагі глыбока вывучаюць сучасныя праблемы сусветнай сацыяльнай псіхалогіі, псіхалогіі працы і кіравання, псіхалагічных асновах работы з кадрамі, псіхалогіі камунікацый, а таксама авалодваюць навыкамі правядзення сацыяльна-псіхалагічнага трэнінгу, арганізацыйнага і сямейнага кансультавання. Яны скарыстоўваюць свае веды ў галіне кіравання, бізнесу, масавых камунікацый у якасці сацыяльнага псіхолага; псіхолага — у сацыяльна-педагагічных і прафесійна-арыентацыйных службах, ва ўстановах сістэмы адукацыі і выхавання.

Аддзяленне **інфармацыі і камунікацыі** (сацыяльныя тэхналогіі) вядзе падрыхтоўку па двух спецыялізацыях — інфармацыя і камунікацыя ў арганізацыях; інфармацыя і камунікацыя ў сістэмах масавых паводзін.

Студэнты аддзялення вывучаюць адну з найбольш перспектыўных і папулярных галін сацыяльнай навукі, якая мае шырокае практычнае прымяненне, — камунікацыю, навуку аб распаўсюджванні і функцыянаванні інфармацыі ў грамадстве. Выпускнікі аддзялення атрымліваюць кваліфікацыю "*Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі: сацыяльныя тэхналогіі. Выкладчык сацыяльна-палітычных дысцыплін*".

Студэнты, якія спецыялізуюцца па арганізацыйнай камунікацыі, атрымліваюць паглыбленыя веды па кіраванні персаналам і чалавечымі рэсурсамі. Таксама яны вывучаюць асновы тэорыі інавацый, тэорыі прыняцця кіраўнічых рашэнняў, вядзення дзелавых перагавораў, сувязяў з грамадскасцю ў дзелавой сферы, вырашэння ўнутрыарганізацыйных і міжарганізацыйных канфліктаў. Яны змогуць працаваць у органах дзяржаўнага кіравання, камерцыйных і грамадскіх аб'яднаннях, аналітычных, рэкламных і маркетынгавых службах, арганізуючы інфармацыйную падтрымку кіраўнічых рашэнняў.

Выпускнікі, якія спецыялізуюцца ў галіне масавай камунікацыі, вывучаюць законы фарміравання і функцыянавання грамадскай думкі, уплыў СМІ на асобу і грамадства, медыяпланаванне, рэкламу, сацыяльны менеджмент, вядзенне перагавораў, арганізацыю і правядзенне электаральных даследаванняў. Іх веды запатрабаваныя ў органах дзяржаўнага кіравання, арганізацыях, СМІ, прэс-службах, службах па сувязях з грамадскасцю, грамадскіх аб'яднаннях, даследчых цэнтрах.

# ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**_Дэкан — прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь Міхаіл Міхайлавіч КАВАЛЁЎ_**

**_Адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31_**
**_Тэл. 217-83-52, 226-12-92_**
**_e-mail: economics@bsu.by; www.economy.bsu.by_**



Эканамічны факультэт заснаваны 1 сакавіка 1999 г. і працягвае слаўныя традыцыі падрыхтоўкі эканамістаў у БДУ, аснова якой была закладзена ў 1925 г., калі менавіта эканамісту быў выдадзены дыплом БДУ № 1. Сёння на факультэце на ўсіх формах навучаюцца 1330 студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, дактарантаў. Вучацца не толькі беларусы, але і каля 100 замежных грамадзян з 20 краін свету. На пяці кафедрах працуюць 60 штатных выкладчыкаў, з якіх 8 прафесараў і дактароў навук, 35 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Па сумяшчальніцтве на факультэце працуе шэраг вядомых навукоўцаў-практыкаў, кіраўнікоў і вядучых спецыялістаў міністэрстваў, банкаў, дзяржаўных установаў, кансалтынгавых фірмаў.

Абітурыенты паступаюць на чатыры аддзяленні: **эканамічная тэорыя** (спецыялізацыя "эканамічная палітыка", кваліфікацыя "*Эканаміст. Выкладчык эканамічных дысцыплін*"), **эканоміка** (спецыялізацыя "аналітычная эканоміка", кваліфікацыя "*Эканаміст-аналітык*"), **фінансы і крэдыт** (спецыялізацыя "банкаўская справа", кваліфікацыя "*Эканаміст*") і **менеджмент** (спецыялізацыя "міжнародны менеджмент", кваліфікацыя "*Эканаміст-менеджэр*").

Першыя тры гады ўсе студэнты атрымліваюць фундаментальную эканамічную (макра-, мікра-, агра-, міжнародную, рэгіянальную), фінансавую (бухулік і аўдыт, карпаратыўныя фінансы, бізнес-планаванне, інвестыцыйны аналіз), а таксама інструментальную (матэматыка, інфарматыка, базы даных, статыстыка, эканаметрыка, прыняцце рашэнняў, лагістыка) падрыхтоўку.

Паглыбленае вывучэнне пачынаецца з III—IV курса ў адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю. Пасля чатырох гадоў навучання ўсе маюць магчымасць здаць выпускны тэст, абараніць выніковую работу і атрымаць дыплом бакалаўра. Далей можна працягваць навучанне і напрыканцы атрымаць традыцыйны дыплом спецыяліста, аднак найлепшыя бакалаўры аддаюць перавагу навучанню па магістэрскіх праграмах за мяжой (найперш у Расіі).

Выпускнікі з дыпломам магістра могуць паступіць у аспірантуру, абараніць дысертацыю і тым самым папоўніць эліту нацыянальнай эканамічнай навукі. Аспірантура існуе па трох спецыяльнасцях: эканамічная тэорыя, эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай, матэматычныя і інструментальныя метады ў эканоміцы. Па спецыяльнасцях **"эканамічная тэорыя"**, **"менеджмент"**, **"фінансы і крэдыт"** існуе завочнае аддзяленне.

На эканамічным факультэце шмат увагі надаецца вывучэнню англійскай мовы як асноўнай мовы міжнародных эканамічных адносін, аднак зацікаўленыя могуць вывучаць і нямецкую мову як мову нашых найважнейшых гандлёвых партнёраў. Многія студэнты навучаюцца адзін ці два семестры за мяжой, прымаюць удзел у сумесных праектах кшталту "Нямецкія інвестыцыі ў Беларусі" (з універсітэтам Анхальт, ФРГ), "Беларусь—Галандыя: знешнеэканамічнае супрацоўніцтва" (з інстытутам менеджменту FONTYS, Галандыя), "Лёсы французскага бізнесу ў Беларусі", а таксама ў праекце пераходу на крэдытна-модульную сістэму з універсітэтамі Магдэбурга і Франкфурта (Германія), Трэнта (Італія), Малага (Іспанія). Мы шчыльна супрацоўнічаем з эканамічнымі факультэтамі МДУ і Санкт-Пецярбургскага універсітэтаў, Кіева-Магілянскай акадэміі і інш.

На факультэце на замову шэрага фірмаў, банкаў, прадпрыемстваў актыўна займаюцца навукова-практычнай работай па бізнес-планаванні, кансалтынгу, электронным бізнесе, маркетынгавых даследаваннях. Існуюць на факультэце карпункты часопісаў "Вестник Ассоциации белорусских банков", "Банковский вестник", "Финансы, учет, аудит".

Нават выдатныя тэарэтычныя веды не гарантуюць выпускнікам магчымасць лёгка адаптавацца да практычнай работы. Таму прадугледжваецца вучэбная і вытворчая практыка: па статыстыцы, фінансах, макра- і мікраэканоміцы, міжнародным менеджменце — як у дзяржаўных установах, так і на найлепшых айчынных і замежных прадпрыемствах, фірмах і банках. Такое ўзаемадзеянне з рэальным сектарам эканомікі дазваляе яшчэ задоўга да заканчэння універсітэта наладзіць кантакт і знайсці месца працы, якое найбольш адпавядае характару і здольнасцям выпускніка. Добра падрыхтаванаму эканамісту не цяжка знайсці працу, але мы ставім больш складаную задачу: дапамагчы нашым выхаванцам знайсці добрую, цікавую, высокааплатную працу. З гэтай мэтай у БДУ створана кадравае агенцтва.

Словам, эканамічны факультэт — сучасны элітарны факультэт для здольных і энергічных абітурыентаў.

Наш лозунг: "Мы разумных робім багацейшымі, а багатых — разумнейшымі".

# ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**_Дэкан факультэта — доктар філалагічных навук, прафесар Іван Сямёнавіч РОЎДА_**

**_Адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31_**
**_Тэл. 222-34-21, 222-36-02_**
**_e-mail: phyl@bsu.by; www. philology.bsu.by_**



**З гісторыі**

Падрыхтоўка спецыялістаў-філолагаў ва універсітэце пачалася ў год яго заснавання: 12 жніўня 1921 г. быў аб'яўлены прыём на этнолага-лінгвістычнае аддзяленне факультэта грамадскіх навук БДУ. Праз год факультэт грамадскіх навук быў рэарганізаваны, і ўвосень 1922 г. на яго базе створаны яшчэ адзін факультэт — педагагічны, у склад якога поруч з іншымі ўвайшло і літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне. На ім працавалі такія вядомыя вучоныя-філолагі, як акадэмік АН БССР І.І. Замоцін, прафесары А.М. Вазнясенскі, М.М. Піятуховіч і інш. З восені 1923 г. лекцыі па беларускай мове і методыцы яе выкладання пачаў чытаць выдатны педагог, класік беларускай літаратуры Якуб Колас.

У перыяд з 1921 г. па 1931 г. дыпломы філолагаў атрымалі 336 выпускнікоў універсітэта, з іх каля пяцідзесяці сталі вядомымі пісьменнікамі (П. Броўка, П. Галавач, П. Глебка, С. Дарожны, А. Звонак, Т. Кляшторны, К. Крапіва, Я. Скрыган і інш.).

7 чэрвеня 1931 г. у межах агульнай рэарганізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта на базе літаратурна-лінгвістычнага і сацыяльна-гістарычнага аддзяленняў педфака быў утвораны Вышэйшы педагагічны інстытут. Адкрыццё самастойнага філалагічнага факультэта ў структуры БДУ адбылося толькі ў 1939 г.

Асновай філалагічнага факультэта на працягу ўсяго перыяду яго дзейнасці былі два аддзяленні — **беларускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры**. З 1947 г. па 1967 г. у склад філфака ўваходзіла яшчэ і аддзяленне журналістыкі. З сярэдзіны 90-х гадоў факультэт пачаў актыўна развівацца, з'явіліся новыя спецыяльнасці: **славянская, класічная, рамана-германская, усходняя філалогія**.



У розныя гады студэнтамі філфака былі народныя пісьменнікі Беларусі Іван Мележ, Ніл Гілевіч, Іван Навуменка, Рыгор Барадулін, акадэмікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А.І. Падлужны, А.І. Жураўскі, член-карэспандэнты НАН Беларусі А.М. Булыка, А.А. Лойка і інш. Некаторыя з іх працавалі на родным для іх факультэце выкладчыкамі.

**Сучасны стан**

На філалагічным факультэце навучаецца больш як 2000 студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў з Беларусі, а таксама з краін блізкага і далёкага замежжа. Навучальны працэс забяспечваюць 16 кафедраў, вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору, лабараторыя тэхнічных сродкаў навучання, 6 спецыялізаваных кабінетаў: беларускай, украінскай, польскай, кітайскай, італьянскай філалогіі, кабінет аўдыёвізуальных сродкаў навучання, а таксама Цэнтр філалагічных паслуг, які ажыццяўляе падрыхтоўку абітурыентаў да ўступных экзаменаў па беларускай, рускай і замежнай мовах, літаратуры, а таксама прапануе курсы па вывучэнні замежных моў для студэнтаў універсітэта. На факультэце працуе больш за 30 дактароў навук і звыш 120 кандыдатаў навук.

Студэнты-філолагі атрымліваюць грунтоўныя веды па беларускай, рускай, сусветнай літаратурах, вывучаюць працэсы гістарычнага развіцця моў, даследуюць іх сучасны стан. Студэнты славянскай, рамана-германскай, усходняй філалогіі праходзяць моўную практыку ў краінах вывучаемай мовы. Для студэнтаў і магістрантаў выкладаецца 130 спецкурсаў, дзейнічае больш за 100 навуковых спецсемінараў па актуальных праблемах сучаснага літаратуразнаўства і лінгвістыкі, якімі кіруюць прафесары і дацэнты факультэта. Апрача таго, кожны студэнт праходзіць паглыбленую падрыхтоўку па адной з выбраных ім спецыялізацый, сярод якіх: камп'ютарная лінгвістыка, тэорыя і практыка перакладу, рыторыка, беларуская мова як замежная, руская мова як замежная.

Падчас вучобы студэнты маюць магчымасць удасканаліць свае навыкі і ўменні работы на камп'ютары, ім створаны ўмовы для свабоднага карыстання ў навучальных мэтах рэсурсамі Internet: на факультэце абсталяваны 3 камп'ютарныя класы.

Студэнты старэйшых курсаў па жаданні вывучаюць дадаткова адну са славянскіх ці заходнееўрапейскіх моў. Апрача таго, маецца магчымасць паралельнага навучання на любым факультэце БДУ для атрымання другой спецыяльнасці: юрыста, эканаміста, псіхолага і інш.

**Дыплом філолага запатрабаваны!**

Дзесяткі тысяч нашых выпускнікоў працуюць настаўнікамі беларускай, рускай, замежных моў і літаратур у школах, каледжах, універсітэтах рэспублікі. У наш час, калі актыўна пашыраюцца самыя розныя формы міжнароднага супрацоўніцтва, выдатная моўная, агульнакультурная падрыхтоўка дазваляе выхаванцам філалагічнага факультэта БДУ паспяхова працаваць у якасці рэферэнтаў, маркетолагаў, перакладчыкаў у арганізацыях, установах, на разнастайных прадпрыемствах краіны. Спецыялісты з гэткім дыпломам сёння запатрабаваны ў выдавецтвах, літаратурных музеях і архівах, аддзелах рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэк і да т.п. Напрыклад, дырэктары і абсалютная большасць супрацоўнікаў Дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Беларусі, Дзяржаўных музеяў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, дырэктары, галоўныя рэдактары, карэктары выдавецтваў ("Мастацкая літаратура", "Беларуская навука", "Вышэйшая школа" і інш.), рэдактары, загадчыкі аддзелаў вядучых літаратурных перыядычных выданняў ("Полымя", "Маладосць", "Нёман" і інш.), навуковыя супрацоўнікі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы, Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з'яўляюцца выпускнікамі філфака БДУ.

Прафесары, дацэнты, выкладчыкі філалагічнага факультэта зрабілі значны ўнёсак у беларускую навуку, шмат спрыялі і спрыяюць развіццю філалагічнай адукацыі ў краіне на карысць духоўнага росквіту нашай Бацькаўшчыны.

# МЕХАНІКА–МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**Дэкан — доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь Мікалай Іосіфавіч ЮРЧУК**

**Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4**

**Тэл. 209-52-48, 209-52-49**

**e-mail: dekanat@bsu.by**



Факультэт рыхтуе па дзвюх спецыяльнасцях — **механіцы** і **матэматыцы**.

У рамках спецыяльнасці "**Механіка**" адбываецца падрыхтоўка па розных напрамках сучаснай механікі і выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій у механіцы. Тут вядзецца навучанне па трох асноўных спецыялізацыях:

— фундаментальныя прыкладныя праблемы механікі суцэльных асяроддзяў;

— САПР і робататэхніка ў механіцы;

— камп'ютарная механіка.

Выпускнікі спецыяльнасці "Механіка" могуць атрымаць працу ў ВНУ на кафедрах механічнага профілю (механікі, супрамату, дэталяў машын і інш.) і прыкладной матэматыкі; у навукова-даследчых падраздзяленнях інстытутаў, звязаных з вывучэннем разнастайных механічных працэсаў і з'яваў, устойлівасцю і надзейнасцю машын і механізмаў; у канструктарскіх і праектных арганізацыях; ва ўстановах і арганізацыях, звязаных з мадэляваннем (матэматычным і камп'ютарным) разнастайных механічных працэсаў і механізмаў. Ім надаецца кваліфікацыя "*Механік. Матэматык-прыкладнік*".

Падрыхтоўка па спецыяльнасці "**Матэматыка**" вядзецца на навукова-вытворчым і навукова-педагагічным аддзяленнях з вывучэннем як класічных матэматычных прадметаў, так і найноўшых праграмна-інфармацыйных асяроддзяў, што дае магчымасць далейшага размеркавання ў такія прэстыжныя арганізацыі, як ЗАТ "БелХард Групп", СП ЗАТ "Міжнародны дзелавы альянс", ІП "ЭПАМ Сістэмз", СП ЗАТ "НаучСофт" і інш.

Выпускнікам навукова-вытворчага аддзялення надаецца кваліфікацыя "*Матэматык*". Як правіла, яны працуюць у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, навукова-даследчых акадэмічных і абласных інстытутах, канструктарскіх бюро, вылічальных і інфармацыйных цэнтрах, на прадпрыемствах прамысловых міністэрстваў і ведамстваў, у банках і г.д.

Студэнты навукова-педагагічнага аддзялення дадаткова вывучаюць прадметы псіхолага-педагагічнага цыкла, атрымліваючы кваліфікацыю "*Матэматык. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі*" і могуць працаваць ва ўстановах адукацыі.

Падрыхтоўка па спецыяльнасці "Матэматыка" адбываецца на спецыялізацыях, якія маюць індывідуальныя навучальныя планы, адпаведныя сённяшнім патрабаванням.

Спецыялізацыя "Матэматычныя метады ў эканоміцы" мае эканамічны напрамак. Студэнтам чытаюцца фундаментальныя матэматычныя курсы, а таксама курсы тэарэтычнай эканомікі — асновы эканамічнай тэорыі, мікраэканоміка, макраэканоміка. Паглыбленаму вывучэнню спецыфікі прымянення матэматычных метадаў прысвячаюцца вялікія курсы статыстычных метадаў эканомікі (эканаметрыкі), эканоміка-матэматычнага мадэлявання, стахастычных метадаў у эканоміцы і фінансах. Выпускнікі гэтай спецыяльнасці працуюць як прафесійныя матэматыкі ў даследчых аддзелах і лабараторыях разнастайных прадпрыемстваў, а таксама як эканамісты-матэматыкі — у банках, страхавых фірмах, агенцтвах па продажу нерухомасці і г.д. Ім надаецца кваліфікацыя "*Матэматык. Матэматык-эканаміст*".

Спецыялізацыя "Матэматычная электроніка" адносіцца да навукова-канструктарскай дзейнасці. Падрыхтоўка спецыялістаў па ёй прадугледжвае паглыбленае вывучэнне логіка-матэматычных асноваў вылічальнай тэхнікі (матэматычнай логікі, тэорыі аўтаматаў, тэорыі графаў, тэорыі алгарытмаў, дыскрэтнай матэматыкі і інш.). Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню пытанняў пабудовы прыладаў вылічальнай тэхнікі на аснове выкарыстання мікрапрацэсарнай тэхнікі і іншых найноўшых дасягненняў мікраэлектронікі. Выпускнікі гэтай спецыяльнасці працуюць у айчынных і замежных навукова-даследчых лабараторыях, праектных арганізацыях, канструктарскіх бюро, на разнастайных прадпрыемствах. Ім надаецца кваліфікацыя "*Матэматык. Канструктар праграмна-апаратных сістэм*".



За час навучання на спецыялізацыі "Камп'ютарная матэматыка" студэнты атрымліваюць веды ў галіне матэматыкі, інфарматыкі, сродкаў камп'ютарнай матэматыкі, інфармацыйных сістэм, матэматычных метадаў аналізу інфармацыі. Выпускнікі гэтай спецыялізацыі з'яўляюцца спецыялістамі па распрацоўцы, стварэнні і суправаджэнні інфармацыйных сістэм любога ўзроўню складанасці; распрацоўцы і прымяненні матэматычных метадаў апрацоўкі, назапашвання, надзейнасці захавання, перадачы і забеспячэння бяспекі інфармацыі. Яны могуць працаваць у навукова-даследчых цэнтрах, IT-кампаніях, прагнозна-аналітычных структурах, органах кіравання, на прадпрыемствах розных галін народнай гаспадаркі, банках, фірмах, навучальных установах. Ім надаецца кваліфікацыя "*Матэматык. Сістэмны аналітык*".

Спецыялізацыя "WEB-праграміраванне і Інтэрнэт-тэхналогіі" спалучае фундаментальную падрыхтоўку ў класічных матэматычных дысцыплінах (матэматычны і функцыянальны аналіз, алгебру, геаметрыю і тапалогію, тэорыю імавернасцяў і інш.), паглыбленае вывучэнне раздзелаў матэматыкі, якія актыўна ўжываюцца ў прыкладных камп'ютарных галінах (лічбавых метадаў, дыскрэтнай матэматыкі і матэматычнай логікі, тэорыі алгарытмаў, матэматычнай статыстыкі і інш.) з навучаннем перадавым тэхналогіям праграміравання. Студэнты вывучаюць курсы па асноўных мовах праграміравання, Java- і NET-тэхналогіях, тэхналогіях праектавання і работы з базамі даных, камп'ютарнай бяспецы і абароне інфармацыі. Выпускнікі могуць працаваць у навукова-даследчых цэнтрах і цэнтрах высокіх тэхналогій; у IT-кампаніях, якія займаюцца распрацоўкай праграмнага забеспячэння і комплексных праграмных рашэнняў на аснове навукаёмістых інфармацыйных тэхналогій; на прадпрыемствах, у органах кіравання, банках, фірмах, навучальных установах. Ім надаецца кваліфікацыя "*Матэматык. Спецыяліст па інфармацыйных тэхналогіях*".

# ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ

**Дэкан факультэта журналістыкі — кандыдат філалагічных навук, дацэнт Сяргей Валянцінавіч ДУБОВІК**

**Адрас: г. Мінск вул. Маскоўская, 15**

**Тэл. 209-59-71, 222-82-68**

**e-mail: Jour@bsu.by; www.journalism.bsu.by**

Састаў выкладчыкаў факультэта: 10 дактароў навук і прафесараў, 41 дацэнт, 36 кандыдатаў навук.

На факультэце дзейнічае 9 кафедраў.

Агульная колькасць студэнтаў — 1185, аспірантаў — 21.

Факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта быў заснаваны адразу пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. Ён стаў першым факультэтам такога кшталту ў сістэме дзяржаўных універсітэтаў былога Савецкага Саюза.

Увесь час факультэт імкліва развіваўся. У 1967 г. былі створаны кафедры гісторыі журналістыкі, тэлебачання і радыёвяшчання, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання. У 1984 г. распачала сваю працу кафедра замежнай журналістыкі і літаратуры.



У 1998 г. на аснове кафедры тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі створаны кафедры перыядычнага друку, сацыялогіі журналістыкі і літаратурна-мастацкай крытыкі, у 1999 г. — кафедра тэхналогій камунікацыі, у 2000 г. — кафедра англійскай мовы і моўных камунікацый, у 2005 г. — кафедра тэорыі і метадалогіі журналістыкі.

За апошнія гады факультэт поўнасцю абнавіў вучэбныя планы, мадэрнізаваў навучальна-тэхнічную базу. Былі адкрыты тры новыя спецыяльнасці (інфармацыя і камунікацыя, міжнародная журналістыка, літаратурная работа), створаны Вучэбны цэнтр камунікацыйных тэхналогій. З 2003 г. прыём на факультэт ажыццяўляецца па двух напрамках: друкаваныя СМІ і аўдыёвізуальныя СМІ. Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па двухузроўневай сістэме. У навучальным працэсе шырока выкарыстоўваюцца сучасныя інавацыйныя метады (напрыклад, рэйтынгавая сістэма ацэнкі ведаў). Выкладчыкамі факультэта па кожнай дысцыпліне падрыхтаваны вучэбна-метадычныя комплексы.

На факультэце працуе некалькі навукова-даследчых лабараторый. Выкладчыкі займаюцца вывучэннем асноўных тэндэнцый развіцця сучаснай журналістыкі па самых розных кірунках (сацыялогія журналістыкі, паліталогія журналістыкі, гісторыя журналістыкі, літаратурна-мастацкая крытыка, літаратурнае рэдагаванне і інш.)

У рэдакцыях вядучых дзяржаўных друкаваных СМІ, тэлеканалаў і радыёстанцый, прэс-службах і службах па сувязях з грамадскасцю, прэс-цэнтрах, інфармацыйных і рэкламных агенцтвах, выдавецтвах створаны філіялы факультэцкіх кафедраў — творчыя лабараторыі журналісцкага майстэрства. Студэнты факультэта выдаюць вучэбную газету "Журналіст".

За гады існавання факультэт выпусціў больш за 6000 прафесійных журналістаў.

Пры факультэце працуюць курсы павышэння кваліфікацыі спецыялістаў кнігавыдання і СМІ, вячэрнія падрыхтоўчыя курсы для абітурыентаў.

Прапануем наступныя спецыяльнасці і спецыялізацыі:

**Журналістыка** (кваліфікацыя "*Журналіст*").

Напрамак: друкаваныя СМІ. Спецыялізацыі: перыядычны друк, дзейнасць інфармацыйных агенцтваў, фотажурналістыка.

Напрамак: аўдыёвізуальныя СМІ. Спецыялізацыі: тэлежурналістыка, радыёжурналістыка; WEB-журналістыка.

**Міжнародная журналістыка** (кваліфікацыя "*Журналіст-міжнароднік*"). Спецыялізацыі: міжнародная журналістыка і палітыка, міжнародная журналістыка і эканоміка.



**Інфармацыя і камунікацыя** (кваліфікацыя "*Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі*"). Спецыялізацыі: аўдыёвізуальная інфармацыя і камунікацыя, інфармацыя і камунікацыя ў сістэме грамадскіх сувязей, рэкламная камунікацыя.

**Літаратурная работа** (кваліфікацыя "*Літаратурны рэдактар*"). Спецыялізацыі: літаратурная работа (рэдагаванне).

Профільнымі дысцыплінамі на факультэце журналістыкі з'яўляюцца: асновы журналістыкі, асновы творчай дзейнасці журналіста, прафесійная этыка журналіста, эканоміка і менеджмент СМІ, дызайн газеты, журналісцкае майстэрства, прававое рэгуляванне дзейнасці СМІ, літаратурнае рэдагаванне, паліталогія, сацыялогія і псіхалогія журналістыкі. Студэнты таксама паглыблена вывучаюць сучасную беларускую, рускую і замежную мову, стылістыку. Шмат увагі ў вучэбных планах надаецца гісторыі беларускай, рускай і замежнай журналістыкі.

У пералік дысцыплін, якія вывучаюцца на працягу 5 гадоў, уваходзяць таксама гісторыя, філасофія, сацыялогія, эканоміка, права, паліталогія, логіка, этыка, літаратурна-мастацкая крытыка, гісторыя мастацтва, беларуская, руская і замежная літаратура.

Пачынаючы з трэцяга курса, кожны студэнт можа сам выбраць кірунак сваёй будучай работы. Па кожнай з пяці спецыяльнасцей прапанаваны дысцыпліны спецыялізацый, курсы па профілі, спецкурсы і спецсемінары.

Навучальны працэс на факультэце журналістыкі ажыццяўляецца ў шчыльным супрацоўніцтве з рэдакцыямі рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі.

Размеркаванне выпускнікоў факультэта журналістыкі штогод адбываецца ў адпаведнасці з планамі Міністэрстваў інфармацыі, адукацыі і эканомікі Рэспублікі Беларусь, а таксама запатрабаваннямі рэдакцый. Попыт на журналісцкія кадры ў краіне на сёння застаецца вельмі высокім.

Шчыра запрашаем на факультэт!

# КОНКУРС ЗАЯВАЎ І ПРАХАДНЫЯ БАЛЫ НА ДЗЁННУЮ БЮДЖЭТНУЮ ФОРМУ НАВУЧАННЯ Ў 2006 ГОДЗЕ

**(працяг)**

| № п/п | Факультэт | Назва спецыяльнасці | Конкурс | | | Прахадныя балы | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | План прыёму | Пададзена заяваў | Конкурс | Агульны | Для гарадскіх | Для вясковых |
| 22 | Гістарычны факультэт | гісторыя, музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, гісторыка-архівазнаўства, дакументазнаўства і інфармацыйнае забеспячэнне кіравання | 115 | 317 | 2,76 | | 29,1 | 28,2 |
| 23 | Механіка-матэматычны факультэт | механіка, матэматыка (спецыялізацыя — камп'ютарная матэматыка), матэматыка (напрамак — навукова-вытворчая дзейнасць), матэматыка (спецыялізацыя — матэматычная электроніка), матэматыка (напрамак — эканамічная дзейнасць), механіка (спецыялізацыя — камп'ютарная механіка), матэматыка (напрамак — навукова-педагагічная дзейнасць), матэматыка (спецыялізацыя — Web-праграміраванне і Internet-тэхналогіі) | 160 | 164 | 1,03 | ** | | |
| 24 | Факультэт журналістыкі | журналістыка (напрамак — друкаваныя СМІ), журналістыка (напрамак — аўдыёвізуальныя СМІ) | 60 | 182 | 3,03 | 36,5* | | |
| 25 | Факультэт журналістыкі | інфармацыя і камунікацыя (напрамак — тэхналогіі камунікацыі) | 15 | 45 | 3,00 | 36,1 | | |
| 26 | Факультэт журналістыкі | літаратурная работа (напрамак — рэдагаванне) | 15 | 55 | 3,67 | 34,5 | | |
| 27 | Факультэт журналістыкі | міжнародная журналістыка | 15 | 39 | 2,60 | 35,9 | | |
| 28 | Факультэт міжнародных адносін | культуралогія (спецыялізацыя — амерыканістыка і англійская мова) | 10 | 45 | 4,50 | 315* | | |
| 29 | Факультэт міжнародных адносін | культуралогія (спецыялізацыя — гебраістыка і англійская мова) | 10 | 50 | 5,00 | | 300 | 259 |
| 30 | Факультэт міжнародных адносін | культуралогія (спецыялізацыя — германістыка і нямецкая мова) | 10 | 27 | 2,70 | 285 | | |
| 31 | Факультэт міжнародных адносін | лінгвакраіназнаўства | 10 | 40 | 4,00 | | 342* | 329 |
| 32 | Факультэт міжнародных адносін | міжнароднае права | 15 | 108 | 7,20 | | 331 | 294 |
| 33 | Факультэт міжнародных адносін | міжнародныя адносіны | 15 | 102 | 6,80 | | 330* | 323 |
| 34 | Факультэт міжнародных адносін | менеджмент (спецыялізацыя — менеджмент у сферы міжнароднага турызму) | 20 | 86 | 4,30 | 327 | | |
| 35 | Факультэт міжнародных адносін | сусветная эканоміка | 15 | 63 | 4,20 | 357 | | |
| 36 | Факультэт міжнародных адносін | сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — пераклад) | 20 | 92 | 4,60 | | 331 | 289 |
| 37 | Факультэт міжнародных адносін | мытная справа | 20 | 91 | 4,55 | | 333 | 268 |
| 38 | Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі | актуарная матэматыка, інфарматыка, пыркладная матэматыка, эканамічная кібернетыка, камп'ютарная бяспека (напрамак — матэматычныя метады і праграмныя сістэмы) | 175 | 214 | 1,22 | | 22,3 | 21,7 |
| 39 | Факультэт радыёфізікі і электронікі | радыёфізіка, фізічная электроніка, камп'ютарная бяспека (напрамак — радыёфізічныя метады і праграмна-тэхнічныя сродкі) | 130 | 123 | 0,95 | ** | | |
| 40 | Факультэт філасофіі і сацыяльных навук | інфармацыя і камунікацыя (напрамак — сацыяльныя тэхналогіі, навукова-педагагічная дзейнасць) | 15 | 64 | 4,27 | | 321 | 295 |
| 41 | Факультэт філасофіі і сацыяльных навук | псіхалогія | 20 | 61 | 3,05 | 284 | | |
| 42 | Факультэт філасофіі і сацыяльных навук | сацыялогія | 20 | 92 | 4,60 | | 288 | 268 |
| 43 | Факультэт філасофіі і сацыяльных навук | філасофія | 15 | 64 | 4,27 | 275 | | |
| 44 | Фізічны факультэт | фізіка (напрамак — навукова-даследчая дзейнасць), фізіка (напрамак — навукова-педагагічная дзейнасць), фізіка (напрамак — кіраўніцкая дзейнасць), фізіка (напрамак — вытворчая дзейнасць) | 125 | 114 | 0,91 | ** | | |
| 45 | Філалагічны факультэт | беларуская філалогія | 65 | 78 | 1,20 | | 23,6 | 21,5 |
| 46 | Філалагічны факультэт | усходняя (кітайская) філалогія | 10 | 23 | 2,30 | 30,8 | | |
| 47 | Філалагічны факультэт | рамана-германская (англійская) філалогія | 25 | 63 | 2,52 | 27,7 | | |
| 48 | Філалагічны факультэт | рамана-германская (італьянская) філалогія | 15 | 36 | 2,40 | 26,8* | | |
| 49 | Філалагічны факультэт | рамана-германская (нямецкая) філалогія | 15 | 26 | 1,73 | 25,7 | | |
| 50 | Філалагічны факультэт | рамана-германская (французская) філалогія | 15 | 17 | 1,13 | 23 | | |
| 51 | Філалагічны факультэт | руская філалогія | 45 | 106 | 2,36 | | 30,6 | 29,6 |
| 52 | Філалагічны факультэт | славянская (польская і беларуская) філалогія | 8 | 13 | 1,63 | 31,5 | | |
| 53 | Філалагічны факультэт | славянская (польская і руская) філалогія | 7 | 16 | 2,29 | 29,3 | | |
| 54 | Хімічны факультэт | хімія (напрамак — навукова-вытворчая дзейнасць), хімія (напрамак — ахова навакольнага асяроддзя), хімія (напрамак — навукова-педагагічная дзейнасць), хімія (спецыялізацыя — хімія лекавых прэпаратаў) | 100 | 112 | 1,12 | ** | | |
| 55 | Эканамічны факультэт | менеджмент (спецыялізацыя — міжнародны менеджмент), эканоміка, эканамічная тэорыя, фінансы і крэдыт | 60 | 201 | 3,35 | 313 | | |
| 56 | Юрыдычны факультэт | паліталогія | 10 | 93 | 9,30 | 315 | | |
| 57 | Юрыдычны факультэт | правазнаўства (для выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ) | 10 | 50 | 5,00 | 28,4 | | |
| 58 | Юрыдычны факультэт | правазнаўства (акрамя выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ), эканамічнае права | 130 | 483 | 3,72 | | 266 | 236* |
| | Разам | | 1936 | 4930 | 2,55 | | | |

Заўвага
* — паўпрахадны бал
** — былі залічаны ўсе абітурыенты, якія вытрымалі ўступныя іспыты

# ШКОЛА АБІТУРЫЕНТА-РАДЫЁФІЗІКА

***7 і 14 красавіка 2007 г. факультэт радыёфізікі і электронікі праводзіць двухдзённую школу абітурыента-радыёфізіка.***

У першы дзень работы школы абітурыенты пазнаёмяцца з патрабаваннямі ўступнага экзамену па фізіцы пры паступленні ў 2007 г., прымуць удзел у рашэнні і разборы разам з выкладчыкамі факультэта тыповых задач экзаменацыйнага ўзроўню, пазнаёмяцца з факультэтам, яго вучэбнай і навуковай базай.

На другі дзень будзе праведзены рэпетыцыйны экзамен па фізіцы ў адпаведнасці з патрабаваннямі ўступнага пісьмовага экзамену.

Вынікі рэпетыцыйнага экзамену будуць высланы ўсім удзельнікам на хатні адрас і будуць выкарыстоўвацца пры паступленні іх на факультэт радыёфізікі і электронікі для прагнозу на этапе здачы дакументаў прахаднога бала і верагоднасці паступлення.

У рамках школы будзе праводзіцца таксама вочная алімпіяда па фізіцы "Абітурыент БДУ — 2007". Пераможцы алімпіяды пры конкурсным залічэнні будуць мець перавагі ў выпадку роўных балаў.

Рэгістрацыя ўдзельнікаў адбудзецца 7 красавіка 2007 г. з 8.00 да 9.30 у фае корпуса факультэта (г. Мінск, вул. Курчатава, 5).

Праезд: аўт. № 47 ад чыгуначнага вакзала (вул. Кірава), аўт. № 28, 30, 90, 104; электрычкай стаўбцоўскага напрамку да станцыі "Гай" ("Роща").

Заяўку на ўдзел у школе просім накіроўваць да 20.03.2007 г. на адрас: 220030, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4, факультэт радыёфізікі і электронікі.

У заяўцы ўказваць прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам), хатні адрас з паштовым індэксам, адрас і назву навучальнай установы, якое вы заканчваеце, прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам) вашага настаўніка фізікі.

Тэлефон для даведак: 209–58–36.

Удзел у школе бясплатны.

# ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ ЗАПРАШАЕ Ў ВОЧНА-ЗАВОЧНУЮ ШКОЛУ

Паважаныя абітурыенты!

У вас з'явілася унікальная магчымасць займацца ў вочна-завочнай школе, арганізаванай выкладчыкамі фізічнага факультэта. Школа дапаможа вам сістэматызаваць і паглыбіць веды па фізіцы і матэматыцы, падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання і ўступных экзаменаў. Удзельнічаць у працы школы могуць не толькі навучэнцы выпускных класаў, але і старшакласнікі.

Завочная школа пачала ўжо сваю дзейнасць (падрабязнасці — на сайце фізічнага факультэта www.physics.bsu.by). Тут вы знойдзеце прыклады рашэння задач па розных раздзелах фізікі і матэматыкі, а таксама задачы для самастойнага рашэння. Калі вы падключыліся да працы завочнай школы не ад пачатку года, то рэкамендуем прапушчаныя ўрокі асвойваць паралельна з новымі.

У канцы кожнага месяца (пачынаючы са студзеня) вам будуць прапанаваны кантрольныя работы па пройдзеных тэмах. Заданні для іх бяруцца з матэрыялаў уступных экзаменаў па фізіцы і заданняў цэнтралізаванага тэсціравання па фізіцы і матэматыцы.

Запрашаем да актыўнага ўдзелу ў працы завочнай школы. Дазнацца пра ступень засвоенасці той ці іншай тэмы, вы зможаце, даслаўшы нам для праверкі свае рашэнні кантрольных работ адным з наступных спосабаў:

поштай на адрас: 220030, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4, Белдзяржуніверсітэт, фізічны факультэт;

электроннай поштай: для задач па фізіцы — на адрас fizfak_Z_F_Sh@tut.by; для задач па матэматыцы — на адрас fizfak_Z_M_Sh@tut.by;

даставіўшы асабіста ў каб. 315 фізічнага факультэта (штодня з 9:00 да 17:00, акрамя выхадных).

На першым аркушы дасланай работы вам неабходна ўказаць звесткі пра сябе: прозвішча, імя, імя па бацьку, e-mail, паштовы індэкс, поўны хатні адрас, нумар хатняга ці мабільнага тэлефона, школу, клас. Гэта дазволіць у далейшым аператыўна інфармаваць вас аб выніках праверкі вашай працы, а таксама аб мерапрыемствах, якія ладзяцца для абітурыентаў на факультэце. Найлепшыя працы, а таксама найбольш актыўныя вучні завочнай школы будуць адзначаны на факультэцкім сайце. Пераможцам па выніках працы ўсёй школы будуць уручацца спецыяльныя дыпломы.

Праграму ў вочнай школе правядуць дасведчаныя выкладчыкі фізічнага факультэта. Заняткі будуць адбывацца раз на месяц, пачынаючы са студзеня 2007 г., у корпусе фізічнага факультэта (г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 2, уваход з боку вул. Бабруйскай). Заняткі бясплатныя. Сачыце за інфармацыяй на сайце www.physics.bsu.by!

У рамках працы вочнай школы для абітурыентаў прадугледжана экскурсія па факультэце, якая дапаможа бліжэй пазнаёміцца з вучэбнымі і навуковымі лабараторыямі, дасць магчымасць паразмаўляць са студэнтамі і выкладчыкамі.

Запрашаем да супрацоўніцтва і жадаем вам поспехаў!

# КОНКУРСЫ І ПРАХАДНЫЯ БАЛЫ НА ПЛАНАВЫЯ МЕСЦЫ Ў 2006 ГОДЗЕ

## (ЗАВОЧНАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

| № п/п | Назва спецыяльнасці | Конкурс чалавек на месца | Прахадны бал | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | агульны | для выпускнікоў гарадскіх устаноў адукацыі | для выпускнікоў вясковых устаноў адукацыі |
| А | Б | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | беларуская філалогія | 0,68 | * | | |
| 2 | біялогія | 2,95 | 20,2 | | |
| 3 | біяэкалогія | 2,7 | 20,3 | | |
| 4 | геаграфія | 0,7 | * | | |
| 5 | геаэкалогія | 0,25 | * | | |
| 6 | дакументазнаўства і інфармацыйнае забеспячэнне кіравання | 4,85 | | 23,9 | 23,3 |
| 7 | журналістыка (напрамак — аўдыёвізуальныя СМІ, друкаваныя СМІ) | 0,78 | * | | |
| 8 | гісторыка-архівазнаўства | 2,33 | | 21,2 | 19 |
| 9 | гісторыя | 0,69 | * | | |
| 10 | матэматыка (напрамкі — навукова-педагагічная дзейнасць, навукова-вытворчая дзейнасць) | 0,53 | * | | |
| 11 | менеджмент (спецыялізацыя — міжнародны менеджмент) | 1,3 | 176 | | |
| 12 | менеджмент (спецыялізацыя — сацыяльны менеджментт) | 0,2 | * | | |
| 13 | музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны | 0,4 | * | | |
| 14 | правазнаўства (для выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ) | 2,8 | 23 | | |
| 15 | правазнаўства (акрамя выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ) | 1,75 | | 188 | 171 |
| 16 | руская філалогія | 0,2 | * | | |
| 17 | сацыяльная работа (спецыялізацыя — медыка-сацыяльная дапамога насельніцтву) | 2,92 | | 208 | 198 |
| 18 | сацыялогія | 1,13 | 155 | | |
| 19 | філасофія | 0,73 | * | | |
| 20 | фінансы і крэдыт | 1,5 | * | | |
| 21 | эканамічная тэорыя | 1,3 | 154 | | |

Заўвага:
* — былі залічаны ўсе абітурыенты, якія вытрымалі ўступныя іспыты

# XVI АЛІМПІЯДА ФПМІ ПА МАТЭМАТЫЦЫ І ІНФАРМАТЫЦЫ "АБІТУРЫЕНТ БДУ – 2007"

Алімпіяда пройдзе ў два туры (першы — завочны). Удзельнікамі алімпіяды могуць стаць навучэнцы сярэдніх школ, гімназій, ліцэяў, каледжаў, а таксама сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь.

Рашэнні задач першага тура трэба аформіць у звычайным вучнёўскім сшытку выразным разборлівым почыркам (малюнкі і схемы могуць быць выкананы алоўкам ці шарыкавай ручкай). На вокладцы сшытка ўказваюцца прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, поўны хатні адрас з паштовым індэксам, нумар хатняга тэлефона, поўная назва навучальнай установы і клас. Сшытак трэба накіраваць па пошце альбо прынесці непасрэдна ў аргкамітэт на адрас: "Алімпіяда ФПМІ", БДУ, прасп. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск. Прыём работ першага тура — да 10 сакавіка 2007 г.

Найлепшыя ўдзельнікі завочнага тура будуць запрошаны на другі, заключны тур, які пройдзе на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, як мяркуецца, 21 красавіка 2007 г. Заключны тур алімпіяды будзе праводзіцца ў форме пісьмовай алімпіяднай работы па дзвюх групах: малодшая група — 8—10-я класы; старэйшая група — 11-я класы.

Пераможцы алімпіяды сярод навучэнцаў 11-х класаў пры паступленні на ФПМІ БДУ ў 2007 г. карыстаюцца пераважным правам на залічэнне пры іншых роўных умовах.

Пераможцы алімпіяды сярод навучэнцаў 8—10-х класаў атрымліваюць права ўдзельнічаць у заключным туры алімпіяды па матэматыцы і інфарматыцы ў наступным навучальным годзе без папярэдняга адбору. Акрамя таго, лепшыя ўдзельнікі алімпіяды сярод навучэнцаў 8—10-х класаў атрымаюць запрашэнне на ўдзел у рабоце Рэспубліканскай летняй навукова-даследчай школы навучэнцаў і настаўнікаў. Падрабязную інфармацыю шукайце на сайце ФПМІ БДУ (http://www.fpmi.bsu.by), тэл. для даведак: (017) 209-50-70.

**Условия задач первого тура для учащихся 11-х классов**

1. Найти все пары целых чисел $x$, $y$, удовлетворяющих системе неравенств

$$\begin{cases} 2x^2+2y^2+24x-28y+167<0, \\ x+2y<\frac{15}{2}. \end{cases}$$

2. Одно число записано ста тройками, а второе — ста шестерками. Найти сумму цифр в произведении этих чисел.
3. Найти все целые значения $x$, удовлетворяющие неравенству

$$x-\frac{1}{2}<2\log_5(x+2).$$

4. Рассмотрим треугольники $ABC$, у которых постоянны сторона $AB$ и длина высоты, опущенной из точки $C$. Указать те треугольники, для которых произведение длин всех высот максимально.
5. В основании четырехугольной пирамиды $SABCD$ лежит квадрат $ABCD$ со стороной $a$. Ребро $SD$ перпендикулярно плоскости основания и равно $h$. Внутри пирамиды расположен прямой круговой цилиндр так, что окружность одного его основания вписана в треугольник $SCD$, а окружность другого основания касается грани $SAB$. Найти высоту цилиндра.
6. Дайте словесное описание алгоритма (оптимального с вашей точки зрения), с помощью которого можно найти сумму квадратов цифр всех натуральных чисел от 1 до заданного натурального числа $N$. Получите значение такой суммы при $N = 2007$.

**Условия задач первого тура для учащихся 8–10-х классов**

1. См. задачу 1 из варианта для 11-х классов.
2. См. задачу 2 из варианта для 11-х классов.
3. Из натуральных чисел от 1 до 100 составлены всевозможные упорядоченные пары с различными элементами. Найти среди них количество пар, произведение которых делится на 21.
4. Окружность проходит через вершины $B, C$ и $D$ трапеции $ABCD$ и касается боковой стороны $AB$ в точке $B$. Основания трапеции равны $a$ и $b$. Найти диагональ $BD$.
5. В кубе $n\times n\times n$ некоторые грани окрашены. Куб разрезали на $n^3$ маленьких кубиков, среди которых оказалось 45 неокрашенных ни с одной стороны. Указать размеры исходного куба.
6. См. задачу 6 из варианта для 11-х классов.

# КАМП'ЮТАРНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ ПРЫРОДНЫХ СХІЛЬНАСЦЯЎ ДА ПРАФЕСІІ

***У Рэспубліканскім цэнтры праблем чалавека Беларускага дзяржаўнага універсітэта распрацавана унікальная методыка камп'ютарнай дыягностыкі. Яна шырока выкарыстоўваецца для тэсціравання старшакласнікаў і выдачы рэкамендацый па выбары прафесіі, ВНУ.***

Звыклы падыход выпускнікоў школ да праблем прафарыентацыі грунтуецца на двух пазіцыях: узровень атрыманых у школе ведаў і інтарэс да той ці іншай прафесіі. Спецыялісты РЦПЧ стварылі праграмны комплекс "ПсіхаЭргаТэст", які даследуе прыродныя характарыстыкі, якія вызначаюць паспяховасць чалавека ў прафесійнай дзейнасці. Даследуюцца прыроджаныя якасці: спецыфіка працы паўшар'яў галаўнога мозгу, сіла нервовай сістэмы. Дыягнастуюцца працаздольнасць, стрэсаўстойлівасць, характарыстыкі памяці, увагі і іншыя прыроджаныя схільнасці да прафесіі.

Гэтае тэсціраванне карысна для кожнага чалавека, незалежна ад узросту. Яно дае магчымасць самапазнання, выяўляе характарыстыкі, атрыманыя ад прыроды, а таксама набытыя здольнасці. Асабліва важна тэсціраванне для тых, хто вырашыў змяніць прафесію, атрымаць другую адукацыю і г.д.

Тэсціраванне ладзіцца для грамадзян, якія дасягнулі 16 гадоў, спрабуюць вызначыцца з выбарам ВНУ, маюць нязгоду з бацькамі наконт выбару жыццёвага шляху, жадаюць атрымаць індывідуальныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы да экзаменаў (праца з рэпетытарам, індывідуальна ці ў невялікай групе, рэжым працы і адпачынку і г.д.).

Атрыманы выніковы дакумент апісвае ўсе выяўленыя якасці. Тут жа змяшчаюцца рэкамендацыі па выбары прафесійнай скіраванасці, арганізацыі працоўнага дня, працоўнага месца, падрыхтоўцы да экзаменаў і г.д.

Працягласць тэсціравання — 1,5 гадзіны. Кошт — 36.800 руб.

Тэсціраванне адбываецца па адрасе: г. Мінск, вул. Ленінградская, д. 16, пакой 105 (геаграфічны факультэт БДУ, раён чыгуначнага вакзала).

Папярэдні запіс па тэл. (8-017) 209-54-75.

У РЦПЧ адкрыты таксама спецкурс "Трэнінг здольнасцяў інтэнсіўнай перапрацоўкі інфармацыі": развіццё ўвагі, паляпшэнне памяці, павелічэнне хуткасці чытання, "зарадка для розуму", развіццё ўяўлення. Навучанне адбываецца двойчы ў тыдзень на працягу 1,5—2 месяцаў.

# АЛІМПІЯДА МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

***Механіка-матэматычны факультэт БДУ абвяшчае пра пачатак алімпіяды сярод старшакласнікаў і абітурыентаў. Прыняць удзел у алімпіядзе могуць вучні старэйшых класаў сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных устаноў, навучэнцы сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў.***

**Условия задач 1-го (заочного) тура**

1. В трапеции $ABCD\,(AB\parallel CD)$ диагонали пересекаются в точке $O$. Площадь треугольника $ABO$ равна 16, а площадь треугольника $CDO$ равна 25. Найти площадь трапеции $ABCD$.
2. Все ребра (в том числе и стороны основания) треугольной пирамиды равны. Найти отношение высоты пирамиды к радиусу вписанного в нее шара.
3. Вычислить $\sin\frac{3\pi}{10}-\sin\frac{\pi}{10}$.
4. Решить неравенство $x+y^2+\sqrt{x-y^2-1}\le 1$.
5. Решить уравнение $x^6-7x^2+\sqrt{6}=0$.
6. Мастер изготовляет в час целое число деталей (больше 5), а ученик — на 2 детали меньше. Мастер выполняет заказ за целое число часов, два ученика вместе — на 1 час быстрее. Сколько деталей в заказе?

Рашэнні задач трэба аформіць у звычайным вучнёўскім сшытку і выслаць заказным лістом на адрас: 220030, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4, БДУ, мехмат. Абавязкова зрабіце пазнаку "Алімпіяда мехмата" і адзначце наступныя звесткі пра сябе: прозвішча, імя, імя па бацьку, паштовы індэкс, дакладны хатні адрас, тэлефон, назва навучальнай установы, клас (курс). У ліст укладзіце канверт з напісаным хатнім адрасам.

Апошні тэрмін адпраўкі рашэнняў — 28 лютага 2007 г.

Удзельнікам алімпіяды, дапушчаным да 2-га (вочнага) тура, паведамяць пра тэрміны яго правядзення па пошце.

Даведкі па тэл. 209-52-49, 209-50-46.

# ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ

**Дэкан — доктар тэхнічных навук, прафесар, Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь Сцяпан Рыгоравіч МУЛЯРЧЫК**

**Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 5**

**Тэл. 209-58-18, 212-19-01**

**e-mail: rfe@bsu.by**



Радыёфізікаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце пачалі рыхтаваць у 1962 г. У 1976 г. быў адкрыты факультэт радыёфізікі і электронікі.

Навучальны працэс забяспечваюць больш за 90 выкладчыкаў, у тым ліку 1 акадэмік і 2 членкарэспандэнты, 15 прафесараў, 63 дацэнты, 49 інжынераў і лабарантаў.

У структуру ўваходзяць 8 кафедраў, 4 навукова-даследчыя лабараторыі, 3 студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, 2 навукова-тэхнічныя цэнтры, 3 вучэбна-навуковыя комплексы.

Факультэт мае шчыльныя навукова-тэхнічныя сувязі з шэрагам замежных навуковых цэнтраў: Рурскім універсітэтам (Германія), Ліёнскай тэхнічнай школай (Францыя), Архускім універсітэтам (Данія), універсітэтамі Нідэрландаў, Бельгіі, Швейцарыі, Італіі, Славеніі, Польшчы, Украіны, Расійскім інстытутам касмічных даследаванняў.

Радыёэлектронныя сістэмы факультэта паспяхова выкарыстоўваліся ў касмічных апаратах "Луназод", "Луназод-21", "Венера-9", "Венера-10", шматлікіх праектах і распрацоўках. Камп'ютарны вымяральны комплекс "УНИПРО" стаў лаўрэатам конкурсу "Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь" 2003 г. Сістэма экспрэс-аналізу палётнай інфармацыі прынята на ўзбраенне ў войсках СПА і ВПС Рэспублікі Беларусь.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па трох спецыяльнасцях — **"Радыёфізіка"**, **"Фізічная электроніка"**, **"Камп'ютарная бяспека"**.

Выпускнікі факультэта працуюць у сферах інфармацыйных тэхналогій, тэлекамунікацый, радыёэлектроннага і аптычнага прыборабудавання, камп'ютарных сетак, праграмаванай электронікі, мікраэлектронікі, нанаэлектронікі, лазерных аптычных тэхналогій. Пасля заканчэння факультэта выпускнікі накіроўваюцца ў навукова-даследчыя інстытуты, прыборабудаўнічыя, радыёэлектронныя, камп'ютарныя, тэлекамунікацыйныя арганізацыі, фірмы, кампаніі, камп'ютарныя дэпартаменты банкаў. Сярод нашых выпускнікоў ёсць кіраўнікі і вядучыя спецыялісты навукова-вытворчых аб'яднанняў, навукова-даследчых інстытутаў, вышэйшых навучальных устаноў, лаўрэаты Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, прэмій Савета Міністраў, буйныя бізнесмены.

Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у двухдзённай школе абітурыента-радыёфізіка, якая будзе працаваць на факультэце 7 і 14 красавіка 2007 г.

У першы дзень абітурыенты пазнаёмяцца з патрабаваннямі ўступнага экзамену па фізіцы пры паступленні ў 2007 г., прымуць удзел у рашэнні і разборы разам з выкладчыкамі факультэта тыпавых задач экзаменацыйнага ўзроўню, пазнаёмяцца з факультэтам, яго навучальнай і навуковай базай.

У другі дзень будзе праведзены рэпетыцыйны экзамен па фізіцы ў адпаведнасці з патрабаваннямі ўступнага пісьмовага экзамену. Яго вынікі будуць дасланы ўсім удзельнікам на хатні адрас і будуць выкарыстоўвацца пры паступленні ўдзельнікаў школы на факультэт для прагнозу прахаднога бала і верагоднасці паступлення.

У рамках школы будзе праводзіцца таксама вочная алімпіяда па фізіцы "Абітурыент БДУ — 2007". Пераможцы алімпіяды пры конкурсным залічэнні будуць мець перавагі ў выпадку роўнасці балаў.

Рэгістрацыя ўдзельнікаў адбудзецца 7 красавіка 2007 г. з 8.00 да 9.30 у фае корпуса факультэта (г. Мінск, вул. Курчатава, 5). Праезд: аўт. № 47 ад чыгуначнага вакзала (вул. Кірава), аўт. № 28, 30, 90, 104; электрычкай Стаўбцоўскага напрамку да прыпынку "Гай" ("Роща").

Заяўку на ўдзел у школе просім накіроўваць да 20.03.2007 на адрас: 220030, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4, факультэт радыёфізікі і электронікі. У заяўцы ўказаць прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам), хатні адрас з паштовым індэксам, адрас і назву навучальнай установы, якую вы заканчваеце; прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам) вашага настаўніка фізікі.

Тэлефон для даведак 209-58-36.

Удзел у школе бясплатны.

# ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**Дэкан факультэта — дацэнт, кандыдат гістарычных навук Сяргей Мікалаевіч ХОДЗІН**

**Адрас: г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6**

**Тэл. 209-55-98, 227-71-00**

**e-mail: hist@bsu.by; www.hist.bsu.by**



Гістарычны факультэт БДУ — найстарэйшая і найбольш аўтарытэтная навучальная і навуковая ўстанова гістарычнага профілю ў нашай краіне.

Факультэт размяшчаецца ў цэнтры Мінска, у самым "гістарычным" будынку Белдзяржуніверсітэта па вул. Чырвонаармейскай. Тут у кастрычніку-лістападзе 1921 г. адбывалася адкрыццё універсітэта і знаходзіўся кабінет першага рэктара БДУ, вядомага гісторыка — прафесара У.І. Пічэты.

На факультэце працуе кваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі састаў: больш за 20 прафесараў і звыш 60 дацэнтаў — вядучых спецыялістаў-гісторыкаў Беларусі. Гістарычны факультэт ганарыцца сваімі шасцю тысячамі выпускнікоў, якія працуюць у сістэме адукацыі, мас-медыя, удзельнічаюць у палітычным жыцці краіны, яе адміністрацыйным кіраванні.

Сістэма выкладання на факультэце скіравана найперш на падрыхтоўку высокакваліфікаваных навукоўцаў, якія ў перспектыве павінны стаць сапраўднымі прафесіяналамі ў галіне гісторыі.

Для гэтага пасля 5-гадовага тэрміну студэнцкага навучання на факультэце дзейнічае 1-гадавая магістратура і 3-гадовая аспірантура. Штогод дзесяткі чалавек паступаюць на гэтыя праграмы.

Падрыхтоўку спецыялістаў ажыццяўляюць 9 кафедраў: гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў; гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу; гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў; новай і найноўшай гісторыі; гісторыі Расіі; гісторыі паўднёвых і заходніх славян; крыніцазнаўства; археалогіі; этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў.



Ва ўмовах сучаснай універсітэцкай адукацыі, якая імкліва развіваецца, традыцыі факультэта спалучаюцца з выкарыстаннем навацый і інфармацыйных тэхналогій.

На гістарычным факультэце падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па чатырох спецыяльнасцях:

— **гісторыя**;
— **гісторыка-архівазнаўства**;
— **музейная справа і ахова помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны**;
— **дакументазнаўства і інфармацыйнае забеспячэнне кіравання**.

На факультэце дзейнічаюць 3 камп'ютарныя класы, дзе забяспечаны выхад у Інтэрнэт. Падчас лекцый выкарыстоўваецца сучасная праекцыйная тэхніка. Усе студэнты факультэта вывучаюць шырокі блок дысцыплін, звязаных з інфармацыйнымі тэхналогіямі. Акрамя таго, студэнты могуць працаваць самастойна ва універсітэцкіх медыятэках, размешчаных недалёка ад факультэцкага корпуса.

Актывізацыі навучальнага працэсу спрыяе музей археалогіі, этнаграфіі і антычнага мастацтва. Яго нумізматычная калекцыя — адна з самых багатых і каштоўных у краіне.

Па заканчэнні 4 семестраў студэнты-гісторыкі на аснове свайго рэйтынгу паспяховасці выбіраюць напрамак спецыялізацыі: айчынная гісторыя, сусветная гісторыя, паліталогія, археалогія, этналогія, гісторыя мастацтваў.

Акрамя таго, студэнты праходзяць археалагічную, этналагічную, архіўна-музейную, педагагічную, інфармацыйную практыкі.

Студэнты-гісторыкі атрымліваюць наступныя кваліфікацыі:

*гісторык, выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін;*

*гісторык-археолаг, выкладчык гісторыі;*

*гісторык-этнолаг, выкладчык гісторыі;*

*гісторык-паліталаг, выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін;*

*гісторык-мастацтвазнаўца, выкладчык гісторыі і мастацтвазнаўства.*

На факультэце вядзецца таксама падрыхтоўка архівістаў, музеязнаўцаў і дакументазнаўцаў — усе гэтыя спецыяльнасці карыстаюцца вялікім попытам.

Пасля другога курса сярод студэнтаў-музеязнаўцаў адбываецца адбор (па выніках рэйтынгу паспяховасці) на напрамак па падрыхтоўцы менеджэраў па турызме. Кваліфікацыя:

*мастацтвазнаўца-музеолаг, выкладчык;*

*гісторык-музеолаг, выкладчык;*

*менеджэр па культурнай спадчыне і турызме.*

На спецыяльнасці "Архівазнаўства" студэнтам многія прадметы выкладаюць не толькі лектары універсітэта, але і кіраўнікі і вядучыя спецыялісты найважнейшых архіваў Беларусі. Кваліфікацыя: *гісторык, архівазнаўца, выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.*

Выпускнікі па спецыяльнасці "Дакументазнаўства і інфармацыйнае забеспячэнне кіравання" пасля размеркавання па напрамках пасля другога курса атрымліваюць кваліфікацыі ў залежнасці ад абранага напрамку:

*дакументазнаўца, арганізатар дакументацыйнага забеспячэння кіравання;*

*дакументазнаўца, арганізатар інфармацыйнага забеспячэння кіравання;*

*дакументазнаўца, спецыяліст па ахове інфармацыі.*

На гэтай спецыяльнасці студэнтам выкладаецца шырокае кола прававых дысцыплін, для чаго прыцягваюцца найлепшыя выкладчыкі юрыдычнага факультэта БДУ.

Паступленне на гістарычны факультэт на ўсе спецыяльнасці адбываецца па адзіных экзаменах і крытэрыях.

Адзнака абітурыентаў складаецца з:

сярэдняга бала школьнага атэстата;

вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай або рускай мове;

вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання па гісторыі Беларусі;

адзнакі на экзамене па сусветнай гісторыі найноўшага часу.

Экзамен па сусветнай гісторыі найноўшага часу прымаецца прыёмнай камісіяй БДУ ў пісьмовай форме. Абітурыент дае разгорнуты пісьмовы адказ на пытанне зацверджанай Міністэрствам адукацыі Праграмы ўступных іспытаў для паступаючых і пісьмова выконвае невялікае тэставае заданне.

Без уступных іспытаў на факультэт прымаюцца пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды па гісторыі.

# ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ

***Начальнік факультэта — палкоўнік Уладзімір Міхайлавіч ЛЕЎШЫК***

***Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 5***

***Тэл. 222-86-96***

***Тэл./факс 222-84-58***

Факультэт пачынаўся з ваеннай кафедры Белдзяржуніверсітэта, створанай 4 лістапада 1926 г. Першым яе кіраўніком быў палкоўнік М.М. Пятроў. У 1926—1931 гг. курс "Вышэйшая дапрызыўная ваенная падрыхтоўка студэнтаў" выкладаў камандзір 39-га Мелякеска-Пугачоўскага кавалерыйскага палка Г.К Жукаў, пазней — маршал і чатырохразовы Герой Савецкага Саюза. На ваеннай кафедры БДУ праходзілі службу Героі Савецкага Саюза палкоўнік А.Ф. Патрын (у 1952—1955) і генерал-маёр А.В. Кірсанаў (у 1955—1960).

За перыяд да 2003 г. ваенная кафедра падрыхтавала тысячы афіцэраў запасу па 13 ваенна-ўліковых спецыяльнасцях.

У 2003 г. кафедра была рэарганізавана ў ваенны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

На цяперашні час факультэт уключае кафедру баявога прымянення артылерыі, кафедру супрацьпаветранай абароны, агульнавайсковую кафедру (у складзе двух цыклаў — падрыхтоўкі кадравых афіцэраў і спецыялістаў агульнавайсковых падраздзяленняў, а таксама радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны).



Падрыхтоўка студэнтаў па праграмах афіцэраў запасу вядзецца па 9 спецыяльнасцях, па праграмах малодшых вайсковых спецыялістаў — па 12 спецыяльнасцях.

Падчас навучання курсанты і студэнты выконваюць практыкаванні стральбы са стралковай зброі, сродкаў узбраення БМП, а таксама практыкаванні па кіраванні баявой тэхнікай.

Падрыхтоўка курсантаў на ваенным факультэце вядзецца па 6 спецыяльнасцях: псіхалогія (спецыялізацыя — маральна-псіхалагічнае забеспячэнне вайсковай дзейнасці), хімія (напрамак — радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона), журналістыка (напрамак — друкаваныя СМІ, спецыялізацыя — ваенная журналістыка), правазнаўства (спецыялізацыя — юрысконсульцкая работа ў ваеннай сферы), міжнародныя адносіны (спецыялізацыя — міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы), геаграфія (напрамак — геаінфармацыйныя сістэмы, спецыялізацыя — ГІС ваеннага прызначэння).

**Псіхалогія**: выпускнік атрымлівае кваліфікацыю *"Псіхолаг, выкладчык псіхалогіі"*. Ён павінен быць падрыхтаваны да арганізацыйна-кіраўніцкай і выкладчыцкай дзейнасці ў галіне арганізацыі і правядзення псіхалагічнай работы ў падраздзяленні. Выпускнік можа заняць першасную афіцэрскую пасаду псіхолага батальёна.



**Хімія**: пасля заканчэння навучання надаецца кваліфікацыя *"Спецыяліст па кіраванні. Хімік-эколаг"*. Выпускнік прызначаны для праходжання службы ў падраздзяленнях і часцях радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны з першай пасадай камандзіра ўзвода, а таксама для працы ў структурах народнай гаспадаркі ў галіне радыяцыйнай бяспекі экалогіі.

**Журналістыка**: выпускнік атрымлівае кваліфікацыю *"Журналіст"*. Ён прызначаны для праходжання ваеннай службы на першаснай афіцэрскай пасадзе карэспандэнта (аглядальніка) ў рэдакцыях вайсковых сродкаў масавай інфармацыі, афіцэра інфармацыйнага цэнтра Узброеных Сіл.

**Правазнаўства**: выпускніку надаецца кваліфікацыя *"Юрыст"*. Яго рыхтуюць да арганізацыйна-кіраўніцкай, навукова-даследчай, экспертна-аналітычнай і выкладчыцкай дзейнасці ў галіне заканатворчай і прымяняльнай практыкі.

**Міжнародныя адносіны**: кваліфікацыя выпускніка *"Спецыяліст па міжнародных адносінах і лінгвістычным суправаджэнні міжнароднай ваеннай дзейнасці (з указаннем мовы)"*. Выпускнік павінен быць падрыхтаваны для замяшчэння першасных афіцэрскіх пасад у структурных падраздзяленнях Міністэрства абароны Беларусі і Генеральнага штаба Узброеных Сіл, якія адказваюць за планаванне, арганізацыю і правядзенне мерапрыемстваў міжнароднага супрацоўніцтва ў ваеннай сферы, а таксама верыфікацыйнай дзейнасці.

**Геаінфармацыйныя сістэмы**: выпускнік атрымлівае кваліфікацыю *"Географ. Спецыяліст па геінфармацыйных сістэмах"*. Ён прызначаны для праходжання вайсковай службы ў навігацыйна-тапаграфічных часцях і падраздзяленнях на першаснай вайсковай пасадзе — картограф.

# ДУА "ІНСТЫТУТ МОЛАДЗІ І АДУКАЦЫІ" БДУ

***Дырэктар — кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Валянціна Іванаўна ДЫНІЧ***

***Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 15***

***Тэл. 224-66-95***

***e-mail: decfdo@bsu.by***

Інстытут моладзі і адукацыі (ІМА) БДУ — адзіная ўстанова ў комплексе універсітэта, якая аказвае адукацыйныя, выдавецкія і турысцкія паслугі. У структуру інстытута уваходзяць факультэты дауніверсітэцкай адукацыі, міжнароднай адукацыі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, а таксама рэдакцыя часопіса "Вышэйшая школа", турагенцтва "Універсум", Цэнтр тэсціравання БДУ, Цэнтр полікультурнай адукацыі і інш. У штаце ІМА больш за 100 супрацоўнікаў. Матэрыяльна-тэхнічная база інстытута (агульная плошча аўдыторнага фонду больш як 1000 кв.м, тры мультымедыйныя камп'ютарныя класы, лінгафонны кабінет, бібліятэка і г.д.) дазваляе арганізаваць эфектыўную мэтанакіраваную працу.

Асноўная мэта дзейнасці інстытута — забеспячэнне ўмоў для рэалізацыі патрэбы беларускіх і замежных грамадзян у якаснай індывідуальна-арыентаванай адукацыі, узровень якой вызначаецца нацыянальнымі прыярытэтамі і міжнароднымі стандартамі, а таксама глабальнымі па маштабамі задач.



Адна з найважнейшых праблем для абітурыентаў — падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання і экзаменаў у БДУ. Цэнтр тэсціравання ІМА прапануе наступныя паслугі:

**У рамках падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання:**

1. Навучанне на падрыхтоўчых курсах. Вечаровыя 4-месячныя падрыхтоўчыя курсы ў групах малой камплектнасці па дысцыплінах "Англійская мова", "Руская мова", "Беларуская мова", "Матэматыка", "Фізіка", "Хімія", "Біялогія", "Чалавек. Грамадства. Дзяржава", "Гісторыя Беларусі".

Пачатак заняткаў — 15-24 студзеня 2007 г.

2. Тэсціраванне па жаданні (без выдачы сертыфікатаў) па ўсіх дысцыплінах, вынесеных на цэнтралізаванае тэсціраванне.

Пачатак чарговага этапу — 21 студзеня. Пасля апрацоўкі вы-нікаў праводзяцца кансультацыі.

**Для падрыхтоўкі да здачы профільнага экзамену:**

1. Навучанне на падрыхтоўчых 4-месячных вечаровых курсах па дысцыплінах "Матэматыка", "Фізіка", "Хімія", "Біялогія", "Сусветная гісторыя", "Руская літаратура", "Беларуская літаратура", "Творчасць" (журфак), "Біблейская гісторыя".



Пачатак заняткаў — 15-24 студзеня.

2. Навучанне на дзённых падрыхтоўчых курсах па профільных дысцыплінах (пачатак заняткаў — май 2007 г.).

3. Рэпетыцыйныя профільныя экзамены па прыродазнаўчых дысцыплінах.

Кантактныя тэлефоны 209-52-81, 209-52-85.

Не менш важная задача — правільна вызначыць напрамак сваёй будучай прафесійнай дзейнасці, выбраць з прапанаваных менавіта сваю спецыяльнасць у БДУ і падрыхтавацца да яе засваення. Гэтую праблему дапамагае вырашыць *факультэт дауніверсітэцкай адукацыі*. Навучанне на факультэце платнае. Форма навучання — дзённая, перыяд навучання — 9 месяцаў. У цяперашні час тут займаюцца больш за 250 грамадзян Рэспублікі Беларусь і каля 300 замежных слухачоў. Пасля паспяховага завяршэння навучання на факультэце замежныя грамадзяне маюць права паступаць у ВНУ Беларусі.

Кантактны тэлефон 227-13-48.

Яшчэ адна задача, якую ва ўмовах дынамічнага развіцця беларускай эканомікі даводзіцца пастаянна вырашаць нават самым паспяховым асобам, якія рэалізавалі свой творчы патэнцыял, — павышэнне кваліфікацыі альбо атрыманне новай. *Факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі*, які ў цяперашні час спецыялізуецца на павышэнні кваліфікацыі экскурсаводаў і падрыхтоўцы менеджэраў турызму, запрашае на курсы перападрыхтоўкі. Навучанне можа быць як вочным, так і завочным.

Кантактны тэлефон 209-58-34.

# ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

***Дырэктар — доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Уладзімір Уладзіміравіч АПАНАСОВІЧ***

***Адрас: г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4***

***Тэл./факс 210-41-06***

***e-mail: sbmt@bsu.by; www.sbmt.by***

Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ ўтвораны ў 1996 г. На працягу 10 гадоў асноўнай задачай інстытута з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў міжнароднага ўзроўню ў галіне бізнес-кіравання і кіравання новымі тэхналогіямі.

У 2004 г. тут упершыню ў Беларусі пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасці **"Бізнес-адміністраванне"**. Гэтая спецыяльнасць сёння з'яўляецца адной з найбольш запатрабаваных і шырока вядомых у свеце. Яна прадугледжвае, што выпускнік авалодае ведамі, навыкамі, а таксама светапоглядам, які грунтуецца на глыбокім разуменні рынкавай эканомікі і яе магчымасцяў, функцый і эканамічнай ролі дзяржавы, усведамленні сацыяльнай адказнасці бізнесу і прыхільнасці да цывілізаваных этычных нормаў яго вядзення. Праграма падрыхтоўкі разлічана на тых, хто плануе ў будучым прэтэндаваць на кіруючыя пасады ў бізнесе.



Навучальны план ахоплівае шматбаковыя аспекты спецыяльнасці: менеджмент, арганізацыйныя паводзіны, бухгалтарскі ўлік, фінансы, маркетынг, стратэгічны і інвестыцыйны менеджмент, інфармацыйныя тэхналогіі, права, кіраванне чалавечымі рэсурсамі. Студэнты вывучаюць асновы эканомікі і колькаснага аналізу. Навучальны працэс мае акрэсленую практычную накіраванасць. Ён спрыяе індывідуальнаму ўдасканаленню праз развіццё такіх уменняў, як прыняцце рашэнняў, камандная работа, лідэрства, вядзенне перагавораў, камунікацыя і прэзентацыя.

Вялікая ўвага ў інстытуце надаецца вывучэнню англійскай мовы, якая з'яўляецца не толькі праграмным прадметам, але і мовай, на якой вядзецца выкладанне асобных дысцыплін. Большасць выкладчыкаў інстытута прайшлі спецыяльную падрыхтоўку ці стажыроўку за мяжой у рамках сумесных міжнародных адукацыйных праектаў.



На сёння інстытут назапасіў значны досвед падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бізнес-кіравання. З 1996 г. у інстытуце рэалізуецца магістэрская праграма па падрыхтоўцы бізнес-спецыялістаў найвышэйшай кваліфікацыі. У 2003 г. выпускнікі гэтай праграмы ўпершыню ў Беларусі атрымалі дзяржаўны дыплом магістра па спецыяльнасці "Бізнес-адміністраванне". Паводле ацэнак членаў міжнароднай экзаменацыйнай камісіі, узровень ведаў нашых выпускнікоў адпавядае стандартам якасці заходніх універсітэтаў.

Адна з асноўных адметных асаблівасцяў інстытута — паслядоўнае ўцягванне ў міжнародную адукацыйную прастору. Інстытут наладзіў партнёрскія адносіны са мноствам заходніх універсітэтаў, актыўна ўдзельнічае ў разнастайных міжнародных праектах. Так, пры распрацоўцы навучальнага плана выкарыстоўваўся багаты досвед Інстытута эканомікі Універсітэта Каларада (ЗША). Актыўна развіваецца супрацоўніцтва з універсітэтам Векша (Швецыя), універсітэтам Molde (Нарвегія), універсітэтам MAICH (Грэцыя), універсітэтамі Central Washington, Indiana Northwest і Nebraska Linkoln (ЗША).

У рамках адукацыйных праграм, якія дзейнічаюць у Інстытуце, студэнты маюць магчымасць праходзіць уключанае навучанне ў замежных універсітэтах. У мінулым навучальным годзе нашы студэнты і выкладчыкі ўдзельнічалі ў праграме абмену са Школай менеджменту і эканомікі універсітэта Векша (Швецыя).

Вольны доступ да Internet у камп'ютарных класах інстытута дазваляе студэнтам эфектыўна выкарыстоўваць інфармацыйныя рэсурсы глабальнай сеткі пры падрыхтоўцы да заняткаў. Распрацавана і ўкаранёна інфармацыйная сістэма падтрымкі функцыянавання падраздзяленняў інстытута. Актыўна развіваецца сістэма дыстанцыйнага навучання.

Інстытут мае унікальную бібліятэку, дзе сабраны арыгінальныя навучальныя і навучальна-метадычныя выданні вядучых сусветных спецыялістаў практычна па ўсіх дысцыплінах навучальнага плана.

# ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

***Дырэктар — доктар гістарычных навук, прафесар Пётр Іванавіч БРЫГАДЗІН***

***Адрас: г. Мінск, вул. Батанічная, 15***

***Тэл. 235-17-22, факс 285-31-77***

***e-mail: mail@e-edu.by; www.e-edu.by***

Дзейсныя эканамічныя пераўтварэнні немагчымы без высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія б мелі фундаментальныя веды ў галіне права, эканомікі, кіравання, сацыяльных навук, валодалі сучаснымі тэхналогіямі, маглі без цяжкасцяў працаваць на сусветным узроўні. Аснова эфектыўнасці навучання ў інстытуце — якасць і ўзровень выкладання, навізна навучальных праграм, склад выкладчыцкіх кадраў. Выпускнікі інстытута валодаюць глыбокімі ведамі ў галіне эканомікі і кіравання, а таксама добра разбіраюцца ў пытаннях прававога забеспячэння гаспадарчай дзейнасці.

Спецыяльнасць: **Правазнаўства**

Спецыялізацыя: прававое забеспячэнне бізнесу; кваліфікацыя: *юрыст.*

Студэнты гэтай спецыяльнасці вывучаюць як юрыдычныя дысцыпліны, так і эканамічныя, сацыяльна-псіхалагічныя, грамадска-гуманітарныя, кіраўніцкія. Будучым юрыстам прапануюцца курсы бухгалтарскага ўліку, аналізу гаспадарчай дзейнасці, макра- і мікраэканомікі, тэорыі і практыкі кіравання, псіхалогіі. Інстытут рыхтуе юрыстаў, здольных паспяхова працаваць у сферы бізнесу, кіравання, адвакатуры, праваахоўных органах.



Спецыяльнасць: **Менеджмент**

Спецыялізацыя: кіраванне персаналам; кваліфікацыя: *менеджэр-эканаміст.*

Спецыялізацыя: менеджмент нерухомасці; кваліфікацыя: *менеджэр-эканаміст.*

Гэтая спецыяльнасць дазваляе атрымаць адну з найбольш цікавых прафесій — "менеджэр-эканаміст". Па ёй рыхтуюцца спецыялісты шырокага профілю з рознабаковай эканамічнай і прававой падрыхтоўкай. Студэнты набываюць навыкі аналізу механізму кіравання прадпрыемствам, авалодваюць тэхналогіяй і метадамі працы з людзьмі, атрымліваюць добрую прававую падрыхтоўку. Гэта дае будучаму спецыялісту вялікія прафесійныя магчымасці — ад кіравання фірмай да вырашэння найважнейшых эканамічных праблем на ўзроўні галіны і эканомікі ў цэлым.



Спецыяльнасць: **Сацыяльная работа**

Спецыялізацыя: соцыя-медыка-псіхалагічная дзейнасць; кваліфікацыя: *спецыяліст па сацыяльнай рабоце.*

Сацыяльная работа — перспектыўная новая спецыяльнасць, якая інтэнсіўна развіваецца. Такія спецыялісты патрэбны для вырашэння сацыяльна-псіхалагічных праблем, якія тычацца захавання фізічнага і псіхічнага здароўя, пераадолення наступстваў хваробаў і траўмаў, што вядуць да інваліднасці. Разам з усебаковай агульнагуманітарнай падрыхтоўкай студэнты атрымліваюць веды па псіхалогіі, сацыяльнай медыцыне, тэорыі і практыцы сацыяльнай работы, рэабілітагогіі. Наяўнасць у навучальным плане прававых дысцыплін і менеджменту дазваляе выпускнікам працаваць не толькі ў дзяржаўных структурах (сацыяльная абарона, ахова здароўя, праца, прадпрыемствы, навучальныя ўстановы і г.д.) і грамадскіх арганізацыях (міжнародныя і рэспубліканскія фонды, асацыяцыі, таварыствы), але і самастойна развіваць бізнес у сферы сацыяльных паслуг.

Спецыяльнасць: **Дызайн**

Спецыялізацыя: дызайн прадметна-прасторавых комплексаў; кваліфікацыя: *дызайнер.*

БДУ вядзе падрыхтоўку дызайнераў з 1999 г. Новым у падрыхтоўцы гэтых спецыялістаў з'яўляецца спалучэнне прафесійнага трэнінгу ў галіне праектавання, кампазіцыі, жывапісу і малюнка, пластыкі, фармаўтварэння з выкарыстаннем найноўшых інфармацыйных і матэматычных тэхналогій мадэлявання асяроддзя, з культурнымі, экалагічнымі фактарамі прафесіі. Універсітэт забяспечвае падрыхтоўку дызайнераў па тэорыі і гісторыі мастацтва і дызайну, сучасных стратэгіях фармаўтварэння і праектавання, камп'ютарных тэхналогіях, замежных мовах.

# ДУА "ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛЫ" БДУ



***Рэктар — Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі ФІЛАРЭТ, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, прафесар, доктар багаслоўя***

***Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 24***

***Тэл. 289-11-61, 227-63-67, 229-22-55; факс 289-11-61***

***e-mail: info@cmc.minsk.by; www.inst.by***

Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы" БДУ дзейнічае на падставе ліцэнзіі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь з кастрычніка 2004 г. Падрыхтоўка студэнтаў у інстытуце ажыццяўляецца па дзённай форме навучання як на бюджэтнай, так і на платнай аснове. Сёння ў інстытуце навучаюцца студэнты I—V курсаў і магістратуры.

У цяперашні час інстытут ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасці **"Тэалогія"** з прысваеннем ім кваліфікацыі *"Тэолаг-рэлігіязнаўца. Выкладчык тэалогіі і рэлігіязнаўства"*. Нашы выпускнікі могуць альбо працягнуць навучанне ў магістратуры і аспірантуры, альбо працаваць выкладчыкамі курса "Рэлігіязнаўства" ў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Высокі ўзровень падрыхтоўкі дазваляе ім таксама паспяхова працаваць ў сферы навукі, культуры, царкоўнага і сацыяльнага служэння.

У структуру інстытута ўваходзяць тры кафедры — кафедра багаслоўя і гісторыі Царквы, кафедра біблеістыкі і царкоўна-практычных дысцыплін, кафедра рэлігіязнаўства. Дзейнічаюць навучальная літургічная і навукова-даследчая лабараторыі. Больш за 50 % выкладчыкаў інстытута маюць навуковыя ступені і званні.

Інстытут ажыццяўляе шырокую агульнаадукацыйную і спецыяльную падрыхтоўку. Нашы студэнты, напрыклад, вывучаюць 5 замежных моваў: тры старажытныя (старажытнаяўрэйскую, старажытнагрэчаскую, царкоўнаславянскую) і дзве сучасныя на выбар.

У цыкле спецыяльных дысцыплін вывучаюцца, у прыватнасці, Святое Пісьмо Старога і Новага Запаветаў, біблейская тэксталогія і археалогія, багаслоўе: асноўнае, параўнаўчае, дагматычнае, маральнае, літургіка, патралогія, гамілетыка, гісторыя старажытнага свету і старажытнай царквы, старажытныя ўсходнія цэрквы, гісторыя Рускай Праваслаўнай і Рыма-Каталіцкай Цэркваў, кананічнае права, гісторыя рэлігій, сектазнаўства, аналітычнае рэлігіязнаўства, сучаснае заходняе рэлігіязнаўства, філасофія і гісторыя філасофіі рэлігіі, сярэдневяковая ўсходнеславянская кніжнасць.

У інстытуце існуе магістратура. Мэтай магістэрскай праграмы з'яўляецца падрыхтоўка кадраў высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія спалучаюць паглыбленыя веды агульнагуманітарных, рэлігіязнаўчых і багаслоўскіх дысцыплін з сучаснымі навыкамі навукова-даследчай дзейнасці.

Сёння ў бібліятэцы інстытута назапашаны унікальны фонд навуковай літаратуры па багаслоўскіх, царкоўна-гістарычных, рэлігіязнаўчых і рэлігійна-філасофскіх дысцыплінах. Бібліятэчны фонд і фонд электронных рэсурсаў уключае 9900 назваў (16.034 адзінак захавання).

Перспектыўная праграма навуковых даследаванняў на 2005—2007 г. уключае 6 навуковых кірункаў, якія адпавядаюць профілю падрыхтоўкі спецыялістаў, у прыватнасці: а) Царква і асоба (духоўна-маральны аспект); б) Біблія і яе роля ў жыцці грамадства; в) Царква і грамадства.

# СТУДЭНЦКІ ГАРАДОК БДУ

***На сёння у студэнцкім гарадку БДУ пражывае больш за 6500 чалавек у 10 інтэрнатах. Два інтэрнаты (№ 1 і 10) кватэрнага тыпу, 4 — блочнага (№ 2, 3, 7, 8) і 4 — калідорнага тыпу (№ 4, 5, 6, 9). Ва ўсіх інтэрнатах функцыянуюць пакоі сацыяльнага, спартыўнага і культурна-асветніцкага прызначэння, клубы па інтарэсах і спартыўныя секцыі. Студэнты, якія тут пражываюць, маюць шырокія магчымасці па арганізацыі цікавага і пазнавальнага адпачынку, актыўнага і здаровага ладу жыцця.***



Месцы ў інтэрнаце зараз атрымліваюць больш за 75% студэнтаў, якія маюць у гэтым патрэбу. Яны размяркоўваюцца на падставе пададзенай заявы і паводле рашэння камісіі факультэта па засяленні. Права на пазачарговае засяленне ў інтэрнат маюць:

сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама прыроўненыя да іх;

студэнты-інваліды 1-й і 2-й груп, дзеці-інваліды;

студэнты, якія маюць права на ільготы ў адпаведнасці з артыкуламі Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС" (арт. 18, 19, 23, 24, 25);

студэнты, сем'і якіх пацярпелі ў выніку стыхійных бедстваў, сацыяльных, тэхнагенных і інш. катастроф;

студэнты, якія паступілі ў БДУ на ўмовах мэтавай контрактнай падрыхтоўкі.

Права на засяленне ў інтэрнат у першую чаргу маюць: студэнты-інваліды 3-й групы; студэнты са шматдзетных сем'яў (3 і больш непаўналетніх дзяцей альбо дзяцей, якія навучаюцца ў ВНУ, ССНЗ на дзённай форме навучання); студэнты з сем'яў інвалідаў вайны 1-й і 2-й груп і прыроўненыя да іх (бацька ці маці студэнта з'яўляецца інвалідам вайны ў Афганістане і інш.).

**Міхаіл ЧАРАПЕННІКАЎ,**
**дырэктар студгарадка БДУ**

# ВУЧЭБНЫ ЦЭНТР ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ІСДПМА БДУ

***Дырэктар — Зоя Іванаўна НЕСЦЯРОВІЧ***

***Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, каб. 409***

Вучэбны цэнтр дадатковай адукацыі Інстытута сістэмных даследаванняў праблем моладзі і адукацыі (ІСДПМА) БДУ распачаў сваю працу ў жніўні 2006 г.

Адзін з асноўных напрамкаў дзейнасці цэнтра — рэалізацыя адукацыйных праграм для моладзі, якія забяспечваюць пошук прафесійных схільнасцяў і дапамогу ў асабістым самавызначэнні юнакоў і дзяўчат. У нас ёсць ужо рэалізаваныя праграмы, якія добра зарэкамендавалі сябе.

Інавацыйна-адукацыйная праграма "Школа прадпрымальніцтва для моладзі" (ШПМ) створана для актыўных, мэтанакіраваных маладых людзей 15—22 гадоў, якія жадаюць развіць свае творчыя здольнасці і прадпрымальніцкае мысленне, навучыцца фінансавай граматнасці і выхаваць эканамічную культуру, развіць лідэрскія якасці і нестандартны стыль мыслення, спасцігнуць асновы эканомікі, фінансаў, кіравання і зрабіць усвядомлены выбар прафесіі.

Праграма ШПМ мае прафарыентацыйны характар. Падчас навучання слухачы наведваюць спецкурсы "Фарміраванне і кіраванне камандай" (кіраванне персаналам), "Эфектыўны маркетынг" і інш.

Заняткі вядуць выкладчыкі БДУ, якія маюць досвед кіраўніцкага кансультавання, практыкуючыя спецыялісты, выкладчыкі-трэнеры, паспяховыя бізнесмены.

Навучэнцам старэйшых класаў школ, гімназій і ліцэяў прапануюцца падрыхтоўчыя курсы для паступлення ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, карэкцыйныя праграмы па асобных вучэбных дысцыплінах.

Падрыхтоўчыя курсы дзейнічаюць на працягу навучальнага года (4 гадзіны на тыдзень з кастрычніка па май). Яны скіраваныя не толькі на выпускнікоў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, але і на вучняў 9-х класаў, бо дапамагаюць ім рыхтавацца да далейшага паступлення ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя ўстановы. Для дзесяцікласнікаў, якія жадаюць удасканальваць свае веды па матэматыцы на павышаным узроўні, дзейнічаюць групы па спецкурсе "Нестандартныя метады вырашэння задач павышанай складанасці".

Заняткі на курсах адбываюцца ў малакамплектных групах (5—10 чалавек), што дазваляе забяспечыць індывідуальны характар навучання.

Курсы даюць абітурыентам магчымасць:

— сістэматызаваць атрыманыя ў школе веды;

— пазбавіцца наяўных прабелаў;

— падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання;

— засвоіць неабходныя прадметы на павышаным узроўні;

— удасканальваць навыкі зносінаў дзелавога супрацоўніцтва ў малых групах.

Заняткі на курсах вядуць кваліфікаваныя выкладчыкі БДУ.

Пачатак заняткаў у 2007 годзе — па меры комплектавання груп. Запіс і дадатковая інфармацыя — па тэл. 209-55-18 (Зоя Іванаўна, Дар'я Віктараўна).



# ЛІЦЭЙ БДУ

**Дырэктар — кандыдат хімічных навук**
**Тацццяна Аляксандраўна КАЛЕВІЧ**
**Адрас: г. Мінск, вул. Ульянаўская, 8**
**Тэл./факс 226-00-50, 209-52-65**
**e-mail: lyceum@bsu.by; www.lyceum.bsu.by**

Ліцэй БДУ адкрыўся 17 гадоў таму дзеля пошуку, адбору і навучання таленавітых старшакласнікаў з усёй Беларусі.

Вучэбна-выхаваўчы працэс у ліцэі ажыццяўляюць высокакваліфікаваныя работнікі адукацыі, навукі, культуры. У апошнія гады педагагічны калектыў папоўніўся нашымі выпускнікамі, многія з якіх ужо маюць навуковыя ступені. Больш за палову педагогаў ліцэя БДУ — настаўнікі вышэйшай катэгорыі. 29 выкладчыкаў ліцэя з'яўляюцца кандыдатамі навук.

Мы прапануем 6 профіляў навучання: фізіка, матэматыка, хімія, біялогія, філалогія, гісторыя. У адпаведнасці з профілямі навучання ўступныя іспыты праводзяцца ў форме алімпіяд па двух прадметах, адпаведных профільным уступным экзаменам у БДУ. Без уступных іспытаў у ліцэй залічваюцца пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды.

За апошнія гады ліцэй БДУ стаў адной з самых прэстыжных навучальных устаноў нашай краіны. У 2006 г. сярэдні конкурс склаў 9,6 чалавек на месца.

У ліцэі працуюць платныя вячэрнія курсы для навучэнцаў 8—11 класаў, якія плануюць у далейшым пступаць у ліцэй. Гэтая задача паспяхова рэалізуецца – больш за палову паступіўшых складаюць слухачы згаданых курсаў.



Навучанне ў ліцэі БДУ разлічана на 2 гады, па заканчэнні выпускнікі атрымліваюць атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі. На цяперашні час у ліцэі 24 класы, па 12 у дзвюх паралелях — дзесятай і адзінаццатай. У кожнай паралелі адзін хімічны, тры матэматычныя і па два — фізічныя, біялагічныя, філалагічныя, гістарычныя класы.

Дзейнічае 10 кафедраў: матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі і геаграфіі, беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, замежных моваў, грамадскіх навук, інфарматыкі і фізічнай культуры.

Навучальны працэс у ліцэі БДУ арганізаваны ў форме спараных урокаў. Гэта дазваляе ладзіць заняткі ў форме лекцый, семінараў, практычных заняткаў. Навучальны год для вывучэння профільных прадметаў дзеліцца на чвэрці, для няпрофільных — на семестры і трыместры.

У ліцэі БДУ пяцідзённы навучальны тыдзень. Шосты дзень — субота — прызначаны для рэалізацыі ліцэйскага кампанента (кансультацый, курсаў на выбар) спартыўных і пазакласных мерапрыемстваў.

Мы маем вельмі значныя дасягненні: нашы навучэнцы заваявалі 779 дыпломаў Рэспубліканскай алімпіяды, 78 з іх — у 2006 г.



Асабліва ўражваюць поспехі ліцэістаў на міжнародных алімпіядах — 111 медалёў, сярод якіх 10 залатых, 45 срэбраных і 56 бронзавых. Такім чынам робіцца важкі ўнёсак ва ўмацаванне прэстыжу нашай краіны за мяжой.

Акрамя алімпіяд шмат увагі надаецца і іншым формам пазакласнай работы па прадметах. Гэта навуковыя канферэнцыі навучэнцаў і інтэлектуальныя турніры. Больш за 150 ліцэістаў сталі прызёрамі гэтых спаборніцтваў. Пачынаецца ўсё з навуковай канферэнцыі "Першы крок у навуку", якая ладзіцца штогод напачатку святкавання дня нараджэння ліцэя.

У ліцэі наладжана вельмі эфектыўная сістэма ідэйна-выхаваўчай работы, якая ўключае цікавыя мерапрыемствы, якія з'яўляюцца вынікам дзейнасці вакальнай, танцавальнай, драматычнай студый, спартыўных секцый, тэатра педагогаў.

За увесь час ліцэй БДУ закончылі больш за 3000 навучэнцаў, больш за 500 з іх — з залатымі і срэбранымі медалямі. Практычна ўсе выпускнікі ў год заканчэння ліцэя працягнулі вучобу ў ВНУ Беларусі і за мяжой, каля 75 % з іх — у БДУ. Узровень і якасць атрыманых ведаў, уменняў і навыкаў дазваляе ім вытрымаць самыя складаныя конкурсныя экзамены.

Сярод ліцэістаў 352 чалавекі сталі стыпендыятамі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

У апошнія гады кантроль ведаў выпускнікоў праводзіцца ў форме цэнтралізаванага тэсціравання. Вынікі ліцэістаў прыкладна на 3 балы перавышаюць сярэдні бал па краіне і адпавядаюць іх гадавым адзнакам.

Гэтыя вынікі сведчаць пра высокі ўзровень вучэбна-выхаваўчага працэсу нашай навучальнай установы. Гэта плён мэтанакіраванай і самаадданай працы педагагічнага калектыву. Нашыя настаўнікі, акрамя навучальнай работы, актыўна прапагандуюць свой педагагічны досвед, яны апублікавалі больш за 300 артыкулаў у навукова-метадычных часопісах, а таксама выдалі 140 падручнікаў і навучальна-метадычных дапаможнікаў.

Нашы намаганні атрымалі высокую ацэнку кіраўніцтва краіны. У 2004 г. ліцэю БДУ была ўручана прэмія ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці.

# ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ БДУ

**Дырэктар — кандыдат юрыдычных навук, дацэнт**
**Ігар Раманавіч ВЯРЭНЧЫКАЎ**
**Адрас: г. Мінск, вул. Камсамольская, 21**
**Тэл./факс 289-12-82**
**e-mail: college@bsu.by; www.lawcollege.bsu.by**

*Развіццё*

Юрыдычны каледж БДУ быў адкрыты 1 верасня 2000 г., а ў 2003 г. загадам міністра адукацыі ён быў вызначаны ў якасці базавай сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы па праблемах прававой адукацыі.

Высокі ўзровень падрыхтоўкі ў юрыдычным каледжы пацвярджаецца тым, што ў цяперашні час больш за 95 % нашых былых навучэнцаў працягваюць адукацыю ў беларускіх ВНУ, з іх 40 % — на дзённых аддзяленнях.

Дзякуючы якаснаму прафесарска-выкладчыцкаму складу (25 чалавек маюць навуковыя званні і ступені) за 6 гадоў сваёй дзейнасці каледж стаў адной з найбольш прэстыжных ССНУ краіны.

*Спецыяльнасці і спецыялізацыі*

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па спецыяльнасці 2-24 01 02 **"Правазнаўства"** з наступнымі спецыялізацыямі: дзяржаўна-прававая дзейнасць, судова-прававая дзейнасць, гаспадарча-прававая дзейнасць і кадравая работа. Выпускнікам надаецца кваліфікацыя "юрыст".

*Навучальны працэс*

Навучанне ў каледжы ажыццяўляецца па навучальных планах і праграмах, якія даюць паглыбленую гуманітарную і спецыяльную падрыхтоўку, а таксама адпаведныя практычныя навыкі.

Навучальны працэс забяспечваюць чатыры кафедры: дзяржаўна-прававых і крымінальна-прававых дысцыплін; агульнаправавых і грамадзянска-прававых дысцыплін; сацыяльна-гуманітарных дысцыплін; прыродазнаўчых дысцыплін. Дзейнічаюць два аддзяленні: на аснове агульнай базавай адукацыі і на аснове агульнай сярэдняй адукацыі.

У каледжы функцыянуюць тры камп'ютарныя класы, а таксама лабараторыя заканадаўства, бібліятэка і чытальня з вялікім выбарам найноўшай юрыдычнай літаратуры. Каледж цалкам падключаны да агульнаўніверсітэцкай інфармацыйнай сеткі, мае свабодны выхад у Інтэрнэт.

Іншагароднія навучэнцы аддзялення на аснове агульнай базавай адукацыі забяспечваюцца інтэрнатам.

Асноўнымі базамі вучэбнай і пераддыпломнай практык з'яўляюцца Міністэрства юстыцыі Беларусі, сістэма агульных судоў, Гаспадарчы суд Мінска, органы пракуратуры, раённыя адміністрацыі Мінска і выканкамы раёнаў, суб'екты гаспадарання розных формаў уласнасці.

Выпускнікі каледжа маюць права працягваць навучанне па спецыяльнасці на юрыдычным факультэце БДУ са скарочаным тэрмінам навучання (пачынаючы з III курса).

*Працаўладкаванне*

Выпускнікі юрыдычнага каледжа могуць працаваць ў:

юрыдычных (прававых), кадравых, рэферэнцкіх службах органаў выканаўчай улады (міністэрстваў, ведамстваў і іншых органаў дзяржаўнага кіравання) і органаў мясцовага кіравання і самакіравання (сацыяльнай абароны, ліцэнзавання і рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання, землеўпарадкавання, статыстыкі і інш.);

юрыдычных (прававых), кадравых, рэферэнцкіх службах суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці, некамэрцыйных юрыдычных асобаў (грамадскія арганізацыі, прафесійныя саюзы і г.д.);

органах судовай улады (канцылярыя, статыстыка, архіў, выкананне судовых пастановаў, забеспячэнне судовай вытворчасці і г.д.);

органах пракуратуры (канцылярыя, статыстыка, архіў і г.д.);

установах юстыцыі (органы ЗАГС, натарыяту, адвакатуры, пашпартна-візавыя службы, архівы юрыдычных кансультацый).

*Пазанавучальная дзейнасць*

Нашы выхаванцы прымаюць актыўны ўдзел у спартыўным і культурным жыцці каледжа і універсітэта (гуртках, студыях, клубах ...). Добрай традыцыяй стала правядзенне "Прысвячэння ў навучэнцы каледжа", "Чыста мужчынскага канцэрта", конкурсу "Лэдзі каледж", турніраў "Што? Дзе? Калі?", конкурсу аратарскага майстэрства "Залатавуст", "Дзён каледжа" і многіх іншых мерапрыемстваў.



Наш каледж — навучальная ўстанова для здольных і энергічных юнакоў і дзяўчат. Ён рыхтуе высокакваліфікаваных юрыстаў, якія спалучаюць глыбокія тэарэтычныя веды з уменнем іх практычнага увасаблення. Гэта дазваляе ім знайсці перспектыўную, цікавую, высокааплатную працу, якая стане для іх справай усяго жыцця.

**Інфармацыя аб прыёме ў юрыдычны каледж у 2007 годзе**

(прыём ажыццяўляецца на бюджэтнай і платнай аснове на дзённую і завочную формы навучання)

*Дзённае аддзяленне*

(на бюджэтнай і платнай аснове)

Спецыяльнасць на аснове агульнай базавай адукацыі (9 кл.): 2-24 01 02 — Правазнаўства. Тэрмін навучання — 3 гады 10 месяцаў. Уступныя іспыты: беларуская (руская) мова — дыктоўка, матэматыка — пісьмовая работа.

Падрыхтоўчыя курсы. Для паступаючых на аснове агульнай базавай адукацыі: гадавыя — з кастрычніка па май, кароткатэрміновыя — чэрвень-ліпень, а таксама на працягу года па меры набору груп. Тэл. 289-12-82.

Спецыяльнасць на аснове агульнай сярэдняй адукацыі (11 кл.): 2-24 01 02 — Правазнаўства. Тэрмін навучання — 2 гады 10 месяцаў. Уступныя іспыты: беларуская (руская) мова — ЦТ, матэматыка — ЦТ.

Інтэрнат падчас уступных іспытаў даецца ўсім абітурыентам, на час навучання — толькі навучэнцам на аснове агульнай базавай адукацыі.

*Завочнае аддзяленне*

(на бюджэтнай і платнай аснове)

Спецыяльнасць на аснове агульнай сярэдняй адукацыі (11 кл.): 2-24 01 02 — Правазнаўства (спецыялізацыі: дзяржаўна-прававая дзейнасць, судова-прававая дзейнасць, гаспадарча-прававая дзейнасць і кадравая работа). Тэрмін навучання — 2 гады 10 месяцаў. Уступныя іспыты: беларуская (руская) мова — ЦТ, матэматыка — ЦТ.

На завочную бюджэтную форму могуць пaступаць асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю і працуюць па спецыяльнасці.

Паколькі каледж з'яўляецца структурным падраздзяленнем Беларускага дзяржаўнага універсітэта, то ўступныя выпрабаванні праводзяцца прыёмнай камісіяй БДУ. Парадак прыёму ў каледж рэгулюецца Правіламі прыёму ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, зацверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.02.2006 № 80.

# КУЛЬТУРА, СПОРТ І СТУДЭНЦТВА Ў БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ

***Беларускі дзяржаўны універсітэт дае сваім студэнтам амаль неабмежаваныя магчымасці не толькі ў набыцці прэстыжнай прафесіі, але і ў арганізацыі вольнага часу і адпачынку, а таксама развіцці асобы. Прапануем вам пазнаёміцца з некаторымі з іх.***

*Упраўленне па справах культуры БДУ* — своеасаблівы цэнтр, які каардынуе культурнае жыццё універсітэта. Ён уключае найстарэйшыя на сёння калектывы БДУ — народны ансамбль танца "Крыжачок", народны аркестр народных інструментаў, народны акадэмічны хор студэнтаў, народны студэнцкі драматычны тэатр (з 1998 г. вядомы як тэатр "На балконе") і іншыя разнастайныя студыі і творчыя калектывы, якія развіваюць шматлікія студэнцкія таленты.

Выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта з'яўляюцца ўдзельнікамі народнага фальклорнага ансамбля "Тутэйшая шляхта". Вялікай папулярнасцю карыстаюцца пастаноўкі народнага музычнага тэатра-студыі "На філфаку", створанага ў 1997 г. вядомымі рэжысёрамі Л. Ярмак і С. Глебавым. Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Неруш" вядомы ва ўсім свеце. У 2000 г. "Неруш" прадстаўляў Беларусь на Сусветнай Фалькларыядзе ў Японіі. Для сучаснай беларускай эстрады шмат зрабіла студыя эстраднай песні БДУ: сярод яе выхаванцаў нямала папулярных маладых выканаўцаў, а спявачка Карыяна стала пераможцай тэлевізійнага праекта "Песня года Беларусі". Нязменная цікавасць моладзі да творчасці рок-гуртоў вылілася ў штогадовы фестываль "Такія пернікі", прысвечаны авангарднай музыцы. Штогод адбываецца буйны міжнародны фестываль "Тэатральны куфар": у 2006 г. у ім прынялі ўдзел прадстаўнікі Беларусі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Грэцыі, ЗША, Ірана, Літвы, Расіі, Румыніі, Славеніі, Фінляндыі, Чэхіі, Швейцарыі, Швецыі.




Наш універсітэт добра вядомы сваімі традыцыямі КВЗ, яго каманда не аднойчы станавілася пераможцай гэтай гульні сярод калектываў СНД. Таму не здзіўляе, што Ліга КВЗ БДУ ўзначаліла студэнцкі рух "вясёлых і знаходлівых" у Беларусі.

Вялікай папулярнасцю карыстаецца FM-станцыя "Unistar — радыё БДУ". Сёння ўсе таксама ведаюць пра цудоўны маладзёжны фестываль "Млын моды", які ладзіць Цэнтр сучаснага стылю і моды "Universum models" БДУ. У гэтым мерапрыемстве зараз удзельнічаюць не толькі маладыя мадэльеры, але і будучыя журналісты, рэжысёры, музыканты, дызайнеры, фатографы.



Значную ролю ў дзейнасці студэнцкіх калектываў адыгрываюць органы студэнцкага самакіравання. Дзеля захавання найлепшых традыцый студэнцтва БДУ ў снежні 1994 г. было створана *ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю (УВРМ)*. Яно падтрымлівае развіццё студэнцкага самакіравання і такіх студэнцкіх арганізацый, як Савет студэнтаў БДУ, Савет старастаў, Савет па матэрыяльным стымуляванні і аказанні матэрыяльнай дапамогі студэнтам і аспірантам, студсаветы інтэрнатаў і інш. Акрамя таго, падтрымкай упраўлення карыстаюцца Студэнцкі саюз і Камітэт БРСМ БДУ. УВРМ арганізуе вучобу студэнцкага актыву, лідэраў маладзёжных грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў універсітэта ў "Школе маладзёжнага актыву" і "Школе маладога лідэра". Яно наладжвае сувязі з рэспубліканскімі і замежнымі структурамі па рабоце з моладдзю, універсітэтамі і маладзёжнымі грамадскімі арганізацыямі і аб'яднаннямі. Упраўленне таксама займаецца арганізацыяй другаснай занятасці студэнцкай моладзі на "Кірмашы вакансій", падрыхтоўвае і рэалізуе дабрачынныя праграмы "Радасць дзецям", "Мы разам", "Падзяліся цеплынёй сваёй душы", каардынуе працу "Штаба працоўных спраў БДУ". Штогод праводзяцца конкурсы "Лепшы маладзёжны праект", "Лепшая студэнцкая газета". Усё гэта ажыццяўляецца ў шчыльным узаемадзеянні з рэдакцыяй газеты "Універсітэт" і прэс-службай БДУ.



Акрамя таго, студэнцтва ў БДУ прымае непасрэдны ўдзел у кіраванні універсітэтам праз студэнцкі Савет па якасці адукацыі, які ўплывае на арганізацыю вучэбнага працэсу.

*Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ* налічвае каля 12 тысячаў членаў, уключае ў сябе 16 факультэцкіх і 570 групавых арганізацый. Прафсаюзны камітэт выступае прадстаўніком студэнтаў перад адміністрацыяй універсітэта па ўсіх пытаннях навучання, працы, побыту, аздараўлення, адпачынку. Ён таксама ажыццяўляе на ільготных умовах размеркаванне пуцёвак у санаторый-прафілакторый БДУ.

З 29 лютага 2000 г. плённа працуе *псіхалагічная служба БДУ*. Асноўнай яе мэтай з'яўляецца аптымізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу, умацаванне здароўя і працаздольнасці студэнтаў і супрацоўнікаў.

З верасня 2002 г. у БДУ дзейнічае *спартыўна-аздараўленчы комплекс "Брыганціна"*. Ён размяшчаецца ў маляўнічай мясціне паблізу Радашковічаў. У "Брыганціне" ладзяцца спартакіяды супрацоўнікаў і студэнтаў "Здароўе", студэнцкія семінары і "круглыя сталы". Комплекс можа прымаць адпачывальнікаў нават у зімовы перыяд.

Адначасова з адкрыццём універсітэта ў 1921 г. пачала сваю працу *фундаментальная бібліятэка БДУ*. Яе фонд на цяперашні момант перавышае два мільёны адзінак захоўвання, пастаянна папаўняецца паступленне літаратуры на электронных носьбітах. Сёння бібліятэка супрацоўнічае ў галіне кнігаабмену са 132 арганізацыямі з 24 краін свету. Дзякуючы гэтаму пашыраюцца магчымасці доступу да электроннага каталога, электронных выданняў і сусветных інфармацыйных рэсурсаў.



Акрамя добрага забеспячэння сучаснай камп'ютарнай тэхнікай вучэбных падраздзяленняў, ва універсітэце дзейнічаюць тры *медыятэкі* — агульнауніверсітэцкія камп'ютарныя класы, прызначаныя для самастойнай работы студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і супрацоўнікаў універсітэта. Кожнае рабочае месца ў мэдыятэках аснашчана навушнікамі, мікрафонам, прыладамі чытання DVD-дыскаў і USB-портамі. Палова кам'ютараў мае прыстасаванні для запісу на дыскі CD і DVD, прылады для чытання картаў памяці. У кожнай медыятэцы ўсталяваны шматфункцыянальны сеткавы апарат (прынтэр, сканер, капір). У будучым плануецца адкрыццё яшчэ двух аналагічных цэнтраў.

У 1952 г. пры Белдзяржуніверсітэце быў створаны *спартыўны клуб*, які і сёння займаецца арганізацыяй і правядзеннем разнастайных фізкультурна-аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемстваў, прапагандуе здаровы лад жыцця, стварае студэнцкія спартыўныя секцыі і каманды, праводзіць спартыўныя вечары, агляды-конкурсы і мноства іншых акцый. На сёння ў БДУ дзейнічаюць зборныя па 30 відах спорту, падрыхтоўкай спартсменаў займаюцца 10 заслужаных трэнераў Беларусі. У Алімпійскіх гульнях у Афінах у 2004 г. прынялі ўдзел 9 студэнтаў БДУ. У галоўнай ВНУ краіны навучаюцца вядомыя спартсмены Максім Мірны (тэніс), Алеся Белайчук (вела-спорт), Надзея Астапчук (лёгкая атлетыка), Аляксандра Прывалава (настольны тэніс), Алена Саннікава (лыжы), Аляксандра Бас (плаванне), Аляксандр Кікінёў (грэка-рымская барацьба), Наталля Харанека (атлетыка). Больш за 50 студэнтаў БДУ ўваходзяць у саставы зборных камандаў Рэспублікі Беларусь.



Значнай падзеяй у жыцці універсітэта стала ўрачыстае адкрыццё ў верасні 2006 г. пасля капітальнага рамонту *спорткомплексу "Універсітэцкі"* па вул. Кастрычніцкай. У чатырохпавярховым будынку размяшчаюцца 25-метровы басейн, некалькі спартыўных залаў, аздараўляльны блок з парылкай, утульныя распранальні і душавыя.

Шмат увагі ў БДУ надаецца выхаванню моладзі на аснове нацыянальных культурных і адукацыйных традыцый. Універсітэцкі дворык з размешчанымі ў ім помнікамі славутых землякоў-асветнікаў з'яўляецца папулярным месцам для экскурсій і часткай культурнай інфраструктуры горада. Яшчэ адной знамянальнай з'явай стала адкрыццё ў кастрычніку мінулага году новага *музея гісторыі БДУ* са шматлікімі цікавымі экспазіцыямі, азнаямленне з якімі стане часткай вучэбнага працэсу.

***Кожны, хто вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, знойдзе тут захапленне сабе па душы, а таксама прымяненне сваім талентам і здольнасцям!***

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

18 студзеня 2007 года
Падпісана да друку 17.01.2007 г.
Зак. 30. Тыраж 2500 экз.Ум. друк. арк. 4.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by